Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
27 верасьня 1931 г.
№ 224 (3313)

Плян лесазагатовак павінен быць выкананы

Лясная гаспадарка зьяўляецца адным з важных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У БССР лес—асноўнае багацьце. Лесаматар'ялы вывозяцца ва ўсе рэспублікі краіны Саветаў. Таму плян лесазагатовак і лесавывазкі 1931 г.—рашаючага году пяцігодкі—мае выключна вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне.

Пляны лесазагатовак і лесавывазкі ў БССР у 1931 годзе ў параўнаньні з мінулым годам значна павялічаны. Гэтыя пляны зьяўляюцца ўпаўне рэальнымі. У БССР маюцца ўсе магчымасьці для таго, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць пляны лесазагатовак і лесавывазак.

Як-жа на сёньняшні дзень абстаіць справа з выкананьнем дрова-лесазагатовак і лесавывазак?

Гадавы плян загатоўкі дзелавой драўніны па БССР на 21 верасьня гг. выкананы толькі на 78,9 проц., што-ж да загатоўкі дроў, дык тут справа абстаіць у шмат разоў горш. Гадавы плян па дровазагатоўках на 21 верасьня выкананы ўсяго на 34,3 проц.

Горш за ўсё абстаіць справа з лесавывазкай. На гэтым вучастку работы маюцца вялікія прарывы ў выкананьні пляну. Гадавы плян па вывазцы дзелавой драўніны выкананы на 58,8 проц. і 44,1 проц. па вывазцы дроў. Амаль усе раёны маюць недавыкананьне сваіх плянаў, за выключэньнем аднаго толькі Віцебскага леспрамгасу, які свае гадавое заданьне па вывазцы дроў выканаў на 126,4 проц. і 95,6 проц. па вывазцы дзелавой драўніны.

Паводле пастаноў ЦК КП(б)Б і СНК БССР да 1 кастрычніка 1931 г. у Менск павінна быць завезена 10.500 вагонаў дроў, з якіх Асіпавіцкі леспрамгас павінен даць 3400 вагонаў, Глускі—3800, Бабруйскі—1300, Калінкавіцкі—1000 і 1000 вагонаў Бярэзінскі леспрамгас. Аднак, ня гледзячы на гэта, на 15 верасьня дроў у Менск завезена толькі 3400 вагонаў.

У БССР ёсьць шмат такіх леспрамгасаў кіраўнікі якіх, замест бальшавіцкай работы, мабілізацыі рабочых—лесарубаў на выкананьне і перавыкананьне лесазагатоўчых плянаў па апартуністычнаму адносяцца да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы. Да такіх леспрамгасаў адносяцца: Бярэзінскі, Глускі, Тураўскі і рад іншых.

Недавыкананьне плянаў дрова-лесазагатовак і лесавывазкі кіраўнікі пасобных леспрамгасаў тлумачаць «адсутнасьцю» рабочай і гужавой сілы, «нерэальнасьцю» лесазагатоўчых плянаў і г. д. Паглядзім ці так гэта. Не. Толькі апартуністы, якія не жадаюць выконваць дырэктыў партыі, якія ня вераць у рэальнасьць нашых плянаў, якія ў новай гаспадарча-палітычнай абстаноўцы ня ўмеюць і не жадаюць па-бальшавіцку, па-новаму кіраваць, па-новаму гаспадарыць і працаваць, толькі яны могуць спасылацца на «аб'ектыўныя» прычыны, на «нерэальнасьць» нашых плянаў.

Вось чырвоны сьпіс тых леспрамгасаў, якія па бальшавіцку ня толькі выконваюць, але і перавыконваюць свае лесазагатоўчыя пляны. Напрыклад, Віцебскі леспрамгас па загатоўцы дзелавой драўніны сваё гадавое заданьне выканаў на 134,2 проц., Калінкавіцкі—132,1 проц., Гомельскі—130,4 проц., Бешанковіцкі—123,6 проц., Аршанскі—121,2 проц., Магілёўскі—119,9 проц. і цэлы рад іншых леспрамгасаў. Гэтыя лічбы красамоўна гавораць за тое, што нашы пляны ўпаўне рэальныя, яны могуць быць ня толькі выкананы, але і перавыкананы.

У чым-жа справа? Што перашкаджае пасьпяховаму выкананьню лесазагатоўчых плянаў?

Справа ў тым, што большасьць леспрамгасаў не пераключыліся на бальшавіцкія тэмпы работы, не мабілізавалі рабочых-лесарубаў на выкананьне і перавыкананьне лесазагатоўчых плянаў, не зрабілі для сябе вызадаў на аснове паказаньняў тав. Сталіна, не забясьпечылі лесазагатоўкі сталай рабочай сілай, не правялі мэханізацыю, недастаткова разгарнулі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не ўкаранілі гаспадарчы разьлік, брыгадны мэтад работы, не ліквідавалі абязьлічку, ураўнілаўку, цякучасьць рабочай сілы, не палепшылі культурна-бытавых умоў рабочага-лесаруба.

У радзе выпадкаў партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі недастаткова дапамагалі леспрамгасам у справе выкананьня лесазагатоўчых плянаў. Паасобныя сельскія саветы недастаткова аддавалі ўвагі давядзеньню цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак па загатоўцы і вывазцы лесу, не сачылі за поўным і своячасовым выкананьнем гэтых заданьняў.

Аднэй з галоўных прычын недавыкананьня плянаў лесазагатовак зьяўляецца слабая работа лясной каапэрацыі. Адсутнасьць ініцыятывы і няўменьне арганізаваць забясьпячэньне рабочых прыводзіць да цякучасьці рабочай сілы, прыводзіць да таго, што лесарубу прыходзіцца за два і больш кілёмэтры хадзіць у сталоўку, краму для таго, каб атрымаць прадукты. Забясьпячэньне лесарубаў і возчыкаў не настаўлена яшчэ ў залежнасьць ад выкананьня заданьняў. Ударнікі яшчэ не карыстаюцца вялікімі перавагамі ў забясьпячэньні.

У распараджэньні Лесбелу ёсьць уласны транспарт, які налічвае 3300 коняй, але гэты транспарт скарыстоўваецца надзвычай дрэнна, не па сваім прызначэньні. Ёсьць выпадкі калі ў паасобных леспрамгасах да 40 проц. уласнага транспарту прастойвае нічога ня робячы, каля 24 проц. транспарту скарыстоўваецца для розных паездак служачых і г. д. (Асіповіцкі леспрамгас, Лапіцкі лесавучастак).

Толькі ў гэтым, а ні ў чым іншым тояцца прычыны значнага недавыкананьня лесазагатоўчых плянаў і плянаў лесавывазкі ў БССР.

Застаўся зусім кароткі тэрмін для выкананьня гадавога пляну. Трэба памятаць, што кожная патрачаная хвіліна—гэта крыніцы новых прарываў.

Нармальнае забясьпячэньне заводаў і фабрык драўнянай сыравінай, прамысловасьці і пралетарскіх цэнтраў апалам павінна быць поўнасьцю забясьпечана.

Плян дрова-загатовак рэальны. Ён павінен быць выкананы і перавыкананы.

Сёньня восьмы дзень галадоўкі палітзьняволеных у турмах фашысцкай Польшчы

Хто ўяўляе небясьпеку 10 тысячам палітзьняволеных польскага фашызму,

якія ўзьняліся на барацьбу з сыстэмай катаваньняў,

павінны выступіць з пратэстам супроць турэмных катаў у абарону жыцьця палітзьняволеных

Адозва Цэнтральнага Камітэту МОПР да ўсіх працоўных, да ўсіх членаў МОПРу БССР

Дарагія таварышы!

Супроць фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага, супроць крывавых экспэдыцый на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, супроць прасьледваньня рэвалюцыйных рабочых і сялян, супроць палітыкі ўціску і прыгнечаньня працоўных, супроць бесчалавечных катаваньняў палітзьняволеных і шалёнай падрыхтоўкі да нападу на СССР—паўсталі працоўныя масы Польшчы і Заходняй Беларусі.

10.000 палітзьняволеных, якія сядзяць у турмах Польшчы, змагаюцца не на жыцьцё, а на сьмерць з польскім фашызмам супроць зьверскіх катаваньняў, супроць новага фашысцкага дэкрэту, супроць увядзеньня палявых судоў і пажыцьцёвай катаргі для рэвалюцыянэраў, за вызваленьне ўсіх працоўных Польшчы ад дыктатуры Пілсудзкага голаду, крыві і вайны.

10.000 палітзьняволеных Польшчы абвясьцілі агульную галадоўку. 6 дзён ужо цягнецца гэта галадоўка. Лепшым барацьбітом—перадавому авангарду працоўных мас Польшчы пагражае вялікая небясьпека сьмерці ў гэтай няроўнай барацьбе з польскім фашызмам за час галадоўкі. Патрэбна хуткая і самаахвярная дапамога і абарона жыцьця палітзьняволеных Польшчы.

Цэнтральны камітэт МОПР'у яшчэ раз заклікае ўсіх працоўных, усіх членаў МОПР'у Савецкай Беларусі мабілізавацца на абарону жыцьця палітзьняволеных Польшчы, яшчэ больш узьняць свой голас пратэсту, выказаць пралетарскі абавязак салідарнасьці з рэвалюцыйнымі барацьбітамі Польшчы ў часе іх цяжкай і няроўнай барацьбы з азьвяралымі катамі фашысцкай дыктатуры Польшчы. Гэта наш доўг. Гэтага патрабуюць ад нас нашы браты па клясе—рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне Польшчы.

Усе на дапамогу палітзьняволеным фашысцкай Польшчы. Усе да аднаго, хто разумее цяжкую барацьбу рэвалюцыянэраў, усе да аднаго, хто разумее небясьпеку, якая пагражае палітзьняволеным, галадаючым 7-мы дзень у знак пратэсту супроць крывагага рэжыму ў турмах, супроць забойстваў рэвалюцыянэраў у турмах, супроць палявых судоў і пажыцьцёвай катаргі—павінны неадкладна мабілізавацца, выступіць з пратэстам, дэманстраваць сваю волю да барацьбы з фашызмам, да ўзмацненьня дапамогі палітзьняволеным.

Няхай наш голас пратэсту прагрыміць яшчэ з большай сілай на ўвесь сьвет. Няхай ведаюць фашысты, што працоўныя БССР гатовы грудзямі абараняць жыцьцё нашых братоў, рэвалюцыйных рабочых і сялян Польшчы і Заходняй Беларусі.

ЦК МОПР'у заклікае ўсіх працоўных неадкладна праверыць як выконваюцца абавязкі, прынятыя на агульных сходах-пратэсту па падамозе палітзьняволеным Польшчы, бо толькі матар'яльнай і маральнай дапамогай можна выратаваць рэвалюцыянэраў Польшчы ад галоднай сьмерці і прымусіць фашысцкіх катаў спыніць зьдзекі над палітзьняволенымі.

Лепшым адказам на зьверствы фашызму, лепшым доказам пралетарскай салідарнасьці будуць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы працоўных па выкананьні плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі, мабілізацыі ўсёй мопраўскай арганізацыі на дапамогу партыі і ўраду ў рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы», што ўзмацніць магутнасьць пралетарскай краіны і пабудову сацыялізму ў СССР.

Усе сілы, усю энэргію на дапамогу рэвалюцыянэрам Польшчы.

Ад імя ўсёй арганізацыі МОПР'у БССР Цэнтральны камітэт МОПР'у пасылае гарачае прывітаньне ўсім палітзьняволеным Польшчы і заяўляе, што працоўныя масы Савецкай Беларусі ўсе сілы аддадуць на тое, каб аднаўць рукі польскіх фашыстаў, якія хочуць фізычна зьнішчыць палітзьняволеных. Працоўныя БССР яшчэ з большай напружанасьцю ўзмацняюць сваю ваенную падрыхтоўку, каб быць гатовым да абароны пралетарскай бацькаўшчыны ад пагрозы новай вайны.

Далоў дыктатуру Пілсудзкага, якая зьнішчае лепшых барацьбітоў рэвалюцыі!

Няхай жыве і мацнее рэвалюцыйная барацьба палітзьняволеных Польшчы з фашысцкім рэжымам!

Няхай жыве і мацнее пралетарская салідарнасьць у барацьбе з фашызмам!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы і Заходняй Беларусі—правадыр і кіраўнік надыходзячай пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы!

Цэнтральны камітэт МОПР'у БССР.

Зьверствы польскіх турэмных катаў—ня маюць граніц

БЭРЛІН, 22-IX. Як паведамляюць з Варшавы, польскі друк поўны паведамленьняў аб масавых арыштах сярод рэвалюцыйных рабочых.

За апошнія дні ў адной толькі Варшаве арыштавана каля 50 рабочых па падозраньню ў камуністычнай дзейнасьці. Масавыя арышты праведзены таксама ў правіцыі.

У Беластоку быў арыштаваны бяз усякага повалу рабочы-краўец І. В. Ужо ў сябе на кватэры ён быў зьбіты да страты прытомнасьці. Вобыск нічога ня даў, аднак ён быў забраны ў ахранку, дзе яго бязьлітасна зьбілі, дамагаючыся ад яго прызнаньня, што ён член кампартыі. Ні ў чым ня прызнаўшагася, зьбітага, спухшага, харкаючага крывёю беспартыйнага рабочага ахранькі адправілі ў шпіталь, дзе ён даведаўся, што там загінула трое палітзьняволеных у выніку катаваньняў.

Палітзьняволеныя ва ўсіх турмах пераведзены на крымінальны рэжым. У іх адабрана права на арганізацыю харчовых камун, права сумесных прагулак, пакункі кніг, папірос, у іх адабраны бібліятэкі і г. д. У Пінскай турме адміністрацыя пасадзіла палітзьняволеных з крымінальнымі, якія тэрарызуюць палітзьняволеных. Сярод палітзьняволеных у Беластоцкай турме многа цяжка хворых на сухоты. Яны пазбаўлены медыцынскай дапамогі.

Палітзьняволеныя вядуць непахісную, гераічную барацьбу супроць гвалтаў над імі, люта бароніча свае правы. Амаль ва ўсіх турмах адбываюцца галадоўкі палітзьняволеных.

Супроць змагаючыхся палітзьняволеных ужываюцца ўсе сродкі паліцэйскага тэрору. Забойствы, зьбіваньні, штучнае кармленьне, уціхамірваньне вадой і г. д.

ВАРШАВА, 23-IX. Як паведамляе «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» 21 верасьня ў турме Мысловіцы выбухнуў «бунт» палітзьняволеных. 30 палітзьняволеных адмовіліся прымаць ежу. Зьняволеныя выбіўшы шыбы, вынікулі ежу праз вакно. Таж-ж газэта паведамляе аб пачаўшайся галадоўцы 48 палітзьняволеных у Катовіцкай турме.

Супярэчнасьці імпэрыялістычных драпежнікаў абвастраюцца

„Міралюбівая" дэклярацыя японскага ўраду

ТОКІЁ, 25-IX. Апублікавана дэклярацыя, прынятая ўчора ўвечары на надзвычайным паседжаньні рады міністраў. У дэклярацыі гэтай гаворыцца:

1. Японскі ўрад заўсёды стараўся спрыяць разьвіцьцю прыяцельскіх узаемаадносін з Кітаем. Пажаль, паводзіны кітайскіх афіцыйных асоб у апошнія гады часта зьневажалі нацыянальныя пачуцьці Японіі. Інцыдэнты, у прыватнасьці, мелі месца ў Манчжурыі і ў Манголіі, дзе Японія мае асобныя інтарэсы. Стварылася ўражаньне, што Кітай не адказвае ўзаемнасьцю на японскую палітыку. У такой абстаноўцы кітайскі вайсковы атрад разбурыў 18 верасьня лінію Паўднёва-Мукдэнскай чыгункі блізка Мукдэну і напаў на варту.

2. Становішча стала крытычным улічваючы, што лік войска японскай варты ўздоўж Паўднёва-Мукдэнскай чыгункі складае ўсяго 10 тыс. 400 чалавек, а лік кітайскага войска 220 тыс., улічваючы, апроч таго, што сотні тысяч японскіх разьдзентаў апынуліся пад пагрозай, японская армія ў мэтах папярэджаньня катастрофы, павінна была дзейнічаць хутка. Кітайскія гарнізоны ў блізка адлеглых мясцовасьцях былі разброены. Задача захаваньня міру і парадку была застаўлена ў руках мясцовых кітайскіх арганізацый пад наглядам японскага войска.

3. Пасьля гэтых мер большасьць японскага войска была зьвернута на чыгунку. Да гэтага часу невялікія атрады засталіся толькі ў Мукдэне, Гірыне і некалькіх іншых мясцох. Аднак нідзе няма ваеннай акупацыі, як гэткай.

Дэклярацыя далей абвяргае паведамленьне, што японская ўлада захапіла воднае кіраўніцтва ў Інькоу, кіруе кітайскімі чыгункамі Сынынгай—Чжэнцзятун, Мукдэн—Сінмін і паслала войска на поўнач ад Чаньчуня і Цзяндао.

4. Японскі ўрад,—гаворыцца далей у дэклярацыі,—пастанавіў прыняць меры для папярэджаньня паглыбленьня канфлікту. Японскае войска заняло 21 верасьня Гірын ня з мэтаю ваеннай акупацыі, а толькі для зьнішчэньня пагрозы флянгавага нападу на Паўднёва-Мукдэнскую чыгунку. Як толькі гэта мэта будзе дасягнута, большасьць войска будзе з Гірынскага раёну адазвана.

Далей у дэклярацыі зазначаецца, што пасланыя з Корчы 4000 войска не ўскладняюць міжнароднага становішча, паколькі гэта мера адпавядае дагаворным нормам аб ахове Паўднёва Манчжурскай чыгункі.

5. Японія,—гаворыцца далей у дэклярацыі,—не дамагаецца тэрытарыяльнага захопу Манчжурыі, і не жадае дапушчэньня японскага капіталу да ўдзелу ў разьвіцьці Манчжурыі. Японскі ўрад гатоў супрацоўнічаць з кітайскім урадам з тым, каб папярэдзіць магчымасьць стварэньня катастрафічнага становішча ва ўзаемаадносінах паміж абедзьвюма краінамі. Японскі ўрад гатоў супрацоўнічаць у выпрацоўцы канструкцыйных плянаў назаўсёды зьнішчаючых прычыны магчымых непаразуменьняў у будучым. Японскі ўрад будзе больш чым удзячны, калі апойдзецца разьвязаньне затрудненьня, якое стварае паварот у японска-кітайскіх узаемаадносінах.

ТОКІЁ, 24-IX. Японская вайсковая ўлада зьвярнулася да японскай улады з просьбаю асыгнаваць у сувязі з манчжурскімі падзеямі 1 мільён іен на перасоўваньне войска, а таксама на амуніцыю для іх і 1 мільён іен на ўтрыманьне войска ў Манчжурыі ў працягу месяца.

Змагару за генэральную лінію—

газэце „АКЦЯБР" бальшавіцкае прывітаньне

Толькі ва ўмовах пралетарскай дыктатуры можа мацнець і пашырацца друкаванае слова на мовах нацменшасьцяй

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б—

уперад да новых перамог

ЦК КП(б)Б шле бальшавіцкае прывітаньне газэце „Акцябр" у дзень выхаду яе двухтысячнага нумару.

ЦК спадзяецца, што газэта „Акцябр" і надалей будзе змагацца з яшчэ большай упартасьцю за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, за далейшую бальшавізацыю яўрэйскіх рабочых мас, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б—уперад да новых перамог.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ

„Зьвязда"—„Акцябру"

Бальшавіцкі друк сёньня адзначае буйную перамогу. 2000 нумароў газэты «Акцябр»—гэта 2000 гарачых дзён бальшавіцкай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць апартуністаў справа і «зьлева», гэта—2000 дзён нястомнай упартай барацьбы за бальшавізацыю яўрэйскіх рабочых і працоўных мас, за ажыцьцё рэшткаў і перажыткаў Бунда і іншых дробнабуржуазных яўрэйскіх нацыяналістычных партый, за ўцягваньне яўрэйскіх працоўных мас у рэчышча барацьбы за сацыялізм.

У жорсткіх баёх з шовінізмам і нацыяналізмам усякага роду працякалі гэтыя дні. «Акцябр» у гэты пэрыяд паказаў узоры ленінскай барацьбы за ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі супроць нацыянал-апартуністычных яе скажэньняў.

Недарма аб «Акцябры» з пенай на вуснах так часта ўспамінае замежны яўрэйскі буржуазны і сацыял-фашыцкі друк. Недарма ўнутры нашай краіны клясава-варожыя элемэнты і іх памочнікі горача ненавідзяць гэты баявы орган партыі.

Уступаючы ў сёмы год свайго існаваньня, ідучы насустрач новым баявым дням няхай новыя тысячы нумароў «Акцябра» зьявяцца ў далейшым такой-жа моцнай і вострай зброяй барацьбы за сацыялістычнае наступленьне.

«Зьвязда».

Яшчэ вышэй сьцяг барацьбы

за ленінскую нацыянальную палітыку

У дзень 6-цігадовага юбілею і выхаду 2.000 нумароў газэты «Акцябр», Менскі гарадзкі камітэт КП(б)Б шле шырае бальшавіцкае прывітаньне.

6 год работы газэты як аднэй з мацнейшых і вастрэйшых зброяў партыі—гэта 6 год барацьбы супроць адхілення ад ленінскай лініі партыі, за ленінскае адзінства нашай партыі, супроць нацапартунізму, супроць рэшткаў бундызму—за ленінскую нацыянальную палітыку.

2.000 нумароў газэты—гэта 2.000 моцных удараў па клясавым ворагу і яго агентуры. Гэта памножаная ў многа тысяч раз агітацыя і прапаганда генэральнай лініі партыі, памножаная арганізацыя мас на яе правядзеньне.

Юбілей «Акцябра» адбываецца ў той час, калі рабочыя і калгасьнікі СССР і БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі маюць шмат нябачных дасягненьняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, вядуць разгорнуты наступ па ўсім фронце Гэта ставіць перад друкам рад адказьнейшых задач. Газэта «Акцябр», як актыўны правадзнік генэральнай лініі партыі, мае таксама рад дасягненьняў, паказьнікам якіх зьяўляецца значнае арабочаньне апарату, росту радоў рабселькораў, тыражу і г. д. Моцнасьць газэты, яе вострасьць будуць забясьпечаны толькі тым, што яна ня спыніцца на гэтых дасягненьнях, а на іх аснове будзе рушыцца далей наперад разам з масамі і на чале мас, пад кіраўніцтвам партыі. Моцнасьць і вострасьць газэты будзе забясьпечана далейшым яе набліжэньнем да яўрэйскіх рабочых мас, далейшым іх уцягненьнем ва ўдзел у газэту.

Вітаючы «Акцябр», Менскі гарком спадзяецца, што газэта, працягваючы далейшую перабудову сваёй работы зробіцца яшчэ больш вострай і моцнай зброяй партыі ў барацьбе за яе генэральную лінію—за сацыялізм.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ЦК.

Няхай жыве бальшавіцкі друк—калектыўны агітатар, прапагандыст і арганізатар!

Менскі Гарком КП(б)Б.

Першы нумар газэты «Акцябр», які выйшаў 7 лістапада 1925 г.

Таварышу па барацьбе

Таварышу па барацьбе за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку—газэце „Акцябр" ад газэты „Савецкая Беларусь" шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

2.000 нумароў газэты „Акцябр"—гэта 2.000 моцных цэглін, якія ўкладзены ў падмурак сацыялістычнай пабудовы.

Шлях „Акцябра"—гэта шлях бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам, барацьба на два фронты—з правым і „левым" апартанізмам, прымірэнцтвам да іх барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку, барацьбы супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага контрэволюцыйнага нацдэмакратызму, яўрэйскага шовінізму і шовіні маў розных колераў і адценьняў.

Мы ўпэўнены, што газэта „Акцябр" і надалей будзе з яшчэ большай бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за генэральную лінію партыі, за перамогу сацыялізму.

Няхай жыве ленінская КП(б)Б. Няхай жыве і вашыраецца бальшавіцкае слова!

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь"

Нацкамісія ЦВК БССР—

газэце „Акцябр"

Нацкамісія ЦВК БССР горача вітае газэту «Акцябр»—орган ЦК КП(б)Б на яўрэйскай мове—да 2000-му нумару газэты.

Ідэі бальшавізму ўсё больш і больш захопліваюць шырокія масы пралетарыяту і працоўных усіх нацыянальнасьцей. Усё больш і больш гэтыя масы аслабаняюцца ад уплыву буржуазных, дробна-буржуазных і нацыяналістычных ідэалёгій, гуртуючыся навакол лёзунгаў камуністычнай партыі, прымаюць актыўны ўдзел у пабудове сацыялізму.

«Акцябр» на працягу сваіх 2000 нумароў бесьперапынна вёў барацьбу за бальшавіцкае выхаваньне яўрэйскіх рабочых і працоўных мас, вёў барацьбу супроць апартунізму, нацапартунізму і шавінізмаў усіх колераў, вёў барацьбу за правільнае ажыцьцяўленьне Ленінскай нацпалітыкі партыі, супроць усялякіх адхіленьняў ад яе.

Няхай жыве камуністычная партыя — правадыр рабочае класы і ўсіх працоўных у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве Ленінская нацпалітыка.

Няхай жыве «Акцябр»—прапагандыст і арганізатар яўрэйскіх рабочых і працоўных вакол ідэй Леніна.

Нацкамісія ЦВК БССР.

Чытачы—„Акцябру"

Гомель. Змагару за чыстату генэральнай лініі партыі шчырае бальшавіцкае прывітаньне ад калектыву рабочых фабрыкі «Камінтэрн». Выхад двух тысячнага нумара адзначаем арганізацыяй новых сямі рабкораўскіх брыгад, мабілізуемся на ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну.

Парткалектыў—Кантараў.
Фабком—Гершман.
Адміністрацыя—Рахновіч.
«Голас краўца»—Двоскін.

***

Газэце «Акцябр» стойкаму правадыру ленінскіх ідэй у дзень выхаду двухтысячнага нумару рабочы калектыў абутковай фабрыкі шле бальшавіцкае прывітаньне.

Рабочы калектыў будзе актыўна змагацца за выкананьне вытворчых плянаў, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Парткалектыў, фабком, камсамольскі калектыў.

***

Гомельскі Озет шле палкае прывітаньне юбілейнаму двухтысячнаму нумару «Акцябра». «Акцябр» правільна змагаецца за нацыянальную ленінскую палітыку, за генэральную лінію партыі.

«Озет».

Куткоры і чытачы газэты «Акцябр» вітаюць рэдакцыю «Акцябр» з выпускам 2.000 нумару. Абяцаем шчыльней згрупавацца вакол газэты «Акцябр».

Пост «Акцябра», Бабруйская арцель «Чырвоны Мэталіст».

***

Гомельскія пчаціншчыкі шлюць палкае прывітаньне да 2.000 нумару «Акцябра». Газэта правільна змагалася за выкананьне дырэктыў партыі. Спадзяемся, што «Акцябр» будзе стойка змагацца і правільна праводзіць у далейшым генэральную лінію партыі.

Парткалектыў, фабком, камсамольская ячэйка, адміністрацыя.

Аб „Дню ўраджаю і калектывізацыі"

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Пастаўленая партыяй задача калектывізаваць да 1-I-1932 г. 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак перавыканана. Па БССР калектывізавана 47 проц. сялянскіх гаспадарак, рад раёнаў перашоў ужо да суцэльнай калектывізацыі і канчатковай ліквідацыі кулацтва як клясы.

«Дзень Ураджаю і Калектывізацыі» будзе праходзіць ва ўмовах далейшага разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце, завяршэньня на аснове пасьпяховага выкананьня пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі фундаманту сацыялізму. Асноўнай задачай «Дню Калектывізацыі» павінна быць далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне існуючых калгасаў, правядзеньне масавай растлумачальнай работы за завяршэньне суцэльнай калектывізацыі БССР у 1932 годзе і выкананьне усіх бягучых гаспадарча-палітычных задач (загатоўкі, асеньняя сяўба і г. д.) шырокае растлумачэньне сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў пастановы ЦК КП(б)Б «Аб чарговых задачах у калгасным будаўніцтве».

Выходзячы з гэтага, Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. «Дзень Ураджаю і Калектывізацыі» правесьці з 14-га па 25-е кастрычніка і ператварыць гэтую кампанію ў масавую мабілізацыю рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне калгасаў, на ліквідацыю прарываў па ўборцы і асабліва арганізацыі пераапрацоўкі тэхкультур і здачы бульбы, поўнаму сканчэньню асеньняй сяўбы і ворыва пад зяб, правядзеньню аграмінімуму, поўнаму выкананьню пляну загатовак збожжа і бульбы, поўнаму сканчэньню будаўніцтва ў саўгасах і калгасах і выкананьню пляну па мабілізацыі сродкаў.

2. Разгарнуць работу на аснове шырокай папулярызацыі гаспадарчых дасягненьняў калгасаў па далейшай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак, рашуча пакончыць з самацёкам у гэтай справе, ажывіць работу вярбовачных камісій у калгасах і ініцыятыўных груп у вёсках.

3. Партарганізацыям зьвярнуць галоўную увагу на практычныя мерапрыемствы па арганізацыйным і гаспадарчым замацаваньні калгасаў канчатковым пераводзе усіх калгасаў на зьдзельчыну і дасканалы улік працы ў іх, зьнішчэньне безгаспадарчасьці ў калгасах і саўгасах, далейшая спэцыялізацыя калгасаў, поўная ачыстка калгасаў ад кулацкіх і інш. шкодніцкіх элемэнтаў), лічачы гэта, як асноўную цэнтральную задачу ў справе далейшага ўзмацненьня калгаснага будаўніцтва.

4. Калгасцэнтру арганізаваць ва ўсіх раёнах работу па шырокай справаздачнасьці калгасаў перад шырокімі масамі аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў аб выніках гадавой працы, падрыхтаваўшы ва ўсіх калгасах пляны разьмеркаваньня ураджаю і прыбытку, і прыстасаваўшы выдачу першай паловы дахода.

5. Даручыць фракцыі ЦСПСБ правесьці масавую работу па прадпрыемствах вакол правядзеньня «Дню Ураджаю і Калектывізацыі» аканцэнтраваўшы ўвагу рабочых на посьпехах соцбудаўніцтва ў справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і на задачах якія стаяць перад рабочымі па далейшай калектывізацыі вёскі практыкуючы выезды шэфскіх арганізацый у калгасы, вёскі для правядзеньня кампаніі «Дню Ураджаю і Калектывізацыі», а таксама падвышаючы ўдзел у правядзеньні кампаніі з боку вясковых прафарганізацый.

6. На аснове адозвы ЦК і Саўнаркому аб жывёлагадоўлі шляхам арганізацыі сустрэчных плянаў, арганізацыі шырокую работу па камплектаваньню калгасных таварных фэрм і саўгасаў.

7. ЦК КП(б)Б зьвяртае ўвагу парт-арганізацый МТС і саўгасаў на іх перадавую арганізуючую ролю ў правядзеньні дню «Ураджаю і Калектывізацыі», што патрабуе разгортваньня шырокай работы і ініцыятывы па арганізацыі калгасных мас і аднаасобнікаў вакол выкананьня задач «Дню ураджаю і калектывізацыі».

8. У час правядзеньня «Дню ўраджаю і калектывізацыі» шырока разгарнуць соцспаборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі і вёскамі на поўную рэалізацыю усіх мерапрыемстваў, асабліва па ўборцы бульбы і апрацоўцы тэхкультур, сканчэньні сяўбы і ворыва, поўным выкананьні загатовак збожжа і бульбы і максымальнай мабілізацыі сродкаў.

9. Абавязаць ЦК ЛКСМБ зараз-жа выпрацаваць мерапрыемствы па пагалоўным ўдзеле ўсіх камсамольцаў у правядзеньні «Дню Ураджаю і Калектывізацыі», ускласьці на камсамольскія арганізацыі задачу ператварэньня «Дню Ураджаю і Калектывізацыі» у масавае сьвята працоўнага сялянства за новую калгасную вёску, за новы сацыялістычны быт.

10. Арганізаваць у часе правядзеньня «Дню Ураджаю і Калектывізацыі» ва ўсіх раёнах с-г. выстаўкі па паказе дасягненьняў калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, надаўшы ім спэцыялізаваны характар па раёнах.

11. Абавязаць цэнтральны і раённы друк і радыё шырока асьвятляць ход работы па падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі «Дню ураджаю і Калектывізацыі» на сваіх старонках, арганізуючы пераклічкі мясцовых арганізацый па пытаньнях зьвязаных з гэтай кампаніяй.

12. Даручыць Белдзяржвыдавецтву сваечасова выпусьціць папулярную літаратуру да «Дню Ураджаю і Калектывізацыі».

13. Для кіраўніцтва ўсёй работай па правядзеньні кампаніі ўтварыць цэнтральную камісію ў складзе т. т. Рачыцкага, Міцькова, Гуткіна, Плешакова і Каршакевіча.

Прапанаваць РК КП(б)Б склясьці камісіі ў раёнах.

Вясковыя партячэйкі-арганізатары мас

на баявое выкананьне і перавыкананьне плянаў збожжазагатовак

У глыбокім тыле ўдарных тэмпаў хлебазагатоўчай кампаніі плятуцца Глускі Асіпавіцкі раёны

Сваячасовым сканчэньнем збожжазагатоўчай кампаніі падрыхтуем падарунак Кастрычніку

Клімаўшчына цягнецца ў глыбокім тыле збожжазагатоўчай кампаніі

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.) Ход збожжазагатовак па Клімавіцкім раёне сьведчыць аб тым, што загатоўчыя арганізацыі ,сельсаветы і парт'ячэйкі апартуністычна недаацэньваюць важнай кампаніі. Сельсавет ня ўжыў рашучых захадаў у адносінах да кулацка-заможных гаспадарак. Да ўдзелу ў збожжазагатоўках ня прыцягнута грамадзкасьць, актыў калгасьнікаў і беднякоў вёскі. Гэткая бязьдзейнасьць, якую праяўляюць сельсаветы і парт'ячэйкі ў справе збожжазагатовак, даваяла да таго, што раённы плян загатовак па аднаасобным сэктары выкананы на 12,6 проц.

Асабліва адстаюць Галіцка-Міскі, Забялышанскі, Студзеньскі сельсаветы, якія плян выканалі на 6—7 проц.

Крыху лепш справа абстаіць з ходам збожжазагатовак у сацыялістычным сэктары, дзе раённы плян выкананы на 27 проц.

Клімавіцкі раён з посьпехам можа справіцца з правядзеньнем збожжазагатоўчай кампаніі.

РК КП(б)Б і РВК павінны неадкладна ўжыць захады, якія-б забясьпечвалі ўдарныя тэмпы ў збожжазагатоўках.

Бальзоўскі.

Аб становішчы арганізацыі справы насеннаводзтва ў Горацкім раёне

Заслухаўшы інфармацыю старшыні праўленьня Горацкага калгасаюзу тав. Ячменева аб становішчы арганізацыі насеннаводзтва ў Горацкім раёне, праўленьне Калгасцэнтру канстатуе недапушчальныя адносіны да выкананьня дырэктыў Калгасцэнтру і Наркамзему па пытаньні разьвіцьця насеннаводзтва.

Выходзячы з чаго Калгасцэнтр пастанаўляе: за безадказныя адносіны да разьвіцьця насеннаводзтва ў раёне, дапушчаныя старшынёй Калгасаюзу тав. Ячменевым, абвясьціць яму вымову.

Прапанаваць тав. Ячменеву пад яго асабістую адказнасьць: у дэкадны тэрмін вылучыць аднаго з лепшых калгасьнікаў у якасьці ўпаўнаважанага Калгаснасенсаюзу, каб скончыць да 1-га кастрычніка разьмяшчэньне пасеўплошчаў па калгасах.

Прапанаваць т. т. Ратайка і Ячменеву безадкладна арганізаваць загатоўку насеньня ў раёне. Абавязаць тав. Ратайка камандыраваць у Горацкі раён прадстаўніка Калгаснасенсаюзу для правядзеньня ў жыцьцё гэтай пастановы.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР Мішкоў.

Не даваць патачкі кулаку

БАБРУЙСК. 18-IX (Белта). Плян збожжазагатовак па Глускім раёне на 10-е верасьня выканан на 9,1 проц. гадавога заданьня. Па калгасным сэктары гадавое заданьне выкананa на 26 проц., на аднаасобным—4,2 проц.

Злачынна марудна ідзе спагнаньне па цьвёрдых заданьнях з кулацка-заможных гаспадарак. На 10-е верасьня спагнана ўсяго—8,5 проц. заданьня. Гэта сьведчыць аб апартуністычнай бязьдзейнасьці парт'ячэек і сельсаветаў у пытаньні форсаваньня збожжазагатовак.

Першымі па загатоўках ідуць Макавіцкі сельсавет, які выканаў гадавое заданьне на 19 проц. Клетнянскі —17,9 проц. і Гарадокскі—17,6 проц. Ёсьць сельсаветы, якія ганебна зрываюць збожжазагатоўкі. Так, Карпілаўскі сельсавет выканаў гадавое заданьне на 0,1 проц., Загальскі—1,2 проц., Казуліцкі—2,7 проц., Гацкі—4 проц., Слаба-Гэраманаўскі—5 проц.

Выкананьне пляну пад пагрозай зрыву

БАБРУЙСК. (Белта). Загатоўка збожжа па Асіпавіцкім раёне праходзіць надзвычайна дрэнна. Плянавае заданьне за жнівень месяц выканана ўсяго на 10 проц. Першая пяцідзёнка верасьня таксама не дала належнага эфэкту. Плянавае заданьне за пяцідзёнку выканана на 86 проц. Такія тэмпы загатовак ня толькі не забясьпечваюць выкананьне пляну ў вызначаны тэрмін, а наадварот пагражаюць зрыву яго.

Райкаапсаюз зусім не падрыхтаваўся да правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам поўнасьцю не дадзены. Давядзеньне пляну да вёскі, калгасаў да гэтага часу ня скончана. Злача прадукцыі па кантрактацыі праходзіць дрэнна. Замест 13 каапупаўнаважаных вызначана пакуль 7.

Раённыя арганізацыі недастаткова зварочваюць увагі збожжазагатоўкам. Неабходна пакласьці канец апартуністычнай бязьдзейнасьці і самацёку райкаапсаюзу, забясьпечыць выкананьне плянаў збожжазагатовак у вызначаны тэрмін.

Лубяніцкі сельсавет—у ролі кулацкага абаронцы

БРАГІН, 26-IX. Лубяніцкі сельсавет зусім позна ўзяўся за правядзеньне збожжазагатовак. Сельсаветамі яшчэ не даведзены цьвёрдыя заданьні па здачы кулацка-заможным гаспадаркам.

Паасобныя члены сельсавету на агульных сходах вёсак адкрыта выступаюць супроць гэтай кампаніі, абараняючы кулакоў і заможнікаў.

Партыйная і камсамольская ячэйкі не даюць рашучага адпору вылазкам клясавага ворага. Камсамольцы наваг ня ходзяць на сходы аднаасобнікаў. Парт. ячэйка гэта бачыць, але ня прымае ніякіх мер.

Райком і Райвыканком павінны прыняць рашучыя захады да апартуністаў з Лубяніцкага сельсавету, якія сваёй бязьдзейнасьцю зрываюць збожжазагатоўкі.

Півуноў.

Дукорская парт'ячэйка не стаіць на чале хлебазагатоўчай кампаніі

Выкананьне пляну збожжазагатовак па Дукорскім сельсавеце Пухавіцкага раёну, знаходзіцца пад пагрозай поўнага зрыву.

Дукорскі сельсавет па своему падышоў да збожжазагатовак. Замест таго, каб даць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам, гэткія былі дадзены бедняком. Заможнікі Шашэль Марцін, Шашэль Кірыла і інш. атрымалі па 3 цэнтнэры, у той час, як трэба было даць па 7-10 цэнтнэраў.

У камісію па садзейнічаньні збожжазагатоўкам пралезьлі заможнікі, якая пад іх уплывам правяла кулацкую ўраўнілаўку. Адзін член камісіі гр. Сянчук дамагаўся, каб усім даць заданьне па збожжы, ня гледзячы на становішча, што і было зроблена.

У справу збожжазагатовак ня быў уцягнуты ўвесь мясцовы актыў. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі сельсавету стаяць у баку і не даюць рашучага адпору кулацкай ураўнілаўцы.

Райком КП(б)Б павінен зараз-жа прыняць меры ліквідаваць кулацкую ўраўнілаўку ў збожжазагатоўках.

Трэба зараз-жа даць рашучы адпор і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто зрабіў ураўнілаўку.

Ударнік.

Абарона краіны патрабуе

быць заўсёды на варце, сыстэматычна набываць вайсковыя веды, больш узмацняць сувязь з Чырвонай арміяй, па-ўдарнаму змагацца за выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва

Заўсёды—на варце

Цёмная ноч. Дробны дождж ашчэ больш згушчае цёмру. Далёка, час ад часу бліскае маланка, праз хвіліну да носіцца грукат. Гэта страляе артыляерыя «чырвоных». Пад яе прыкрыцьцём батальён рыхтуе пераправу праз раку.

Знойдзена лодка, адшукалі брод. Батальён пачаў пераправу на левы берег ракі. «Сінія» сваячасова не адкрылі «праціўніка».

Батальён пераправіўся, але наткнуўся на дротавую загароджу. Прышлося на занятым рубяжы пакінуць толькі два разьдзелы.

Камандзір батальёну «сініх», які займае вучастак, дзе зрабілі пераправу «чырвоныя», неспакойны. Нельга адчуваць сябе спакойным, калі «праціўнік» заняў такі важны рубеж. Трэба яго выбіць. Трэба дзейнічаць.

«Чырвоныя» высунуліся на груд, добра ўмацаваліся з фронту, прыкрылі флянгі кулямётамі.

Кулямёты засакаталі з бакоў, спераду. Згрупаваўшыся «сінія» з трох бакоў рушыліся на два разьдзелы «чырвоных». Па полі замігацелі мэтаслёвыя каскі, якія набліжаліся да ракі. Сваёй колькаснай перавагай, сваім кулямётным агнём з флянгаў «сінія» выйтралі. «Праціўнік» быў адкінуты за раку. «Сінія» аднавілі фронт.

Так, у наступах, у абароне, на маршы, пяхотнія, кавалерыйскія, браня выя, артылерыйскія і іншыя часьці Чырвонай арміі правяраюць на практыцы свае веды.

Байцы і камандзіры сур'ёзна адносяцца да свайго экзаміну—манэўраў. Яны памятаюць і ні на хвіліну не забываюцца аб сваім абавязку перад пралетарыятам краіны саветаў і перад працоўнымі масамі ўсяго сьвету.

(Белта).

„Ідуць рашаючыя баі"

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 25-IX. 23 і 24 верасьня праходзіла перагрупіроўка «чырвоных». Зранку разгарнуліся баі перадавых часьцей. На старане «сініх» закончыліся акопныя работы. Былі зроблены ўмацаваньні з калючага дроту. Абарончыя работы на другім рубяжы працягваюцца, а часамі на пасаобных вучастках «чырвоным» удавалася арганізаваць пераправу і атакаваць першую лінію абароны.

На працягу дня некалькі разоў пераходзіў рубеж ад «сініх» да «чырвоных». Трэба адзначыць сьмелыя і ініцыятыўныя дзеяньні другога батальёну Н-скага палка, які ўночы па штурмавому мосьціку ціха і нязпрыкметна пераправіўся праз раку бяз адзінага стрэлу, зьняў роту абараняючага боку. Камуністы і камсамольцы 5-й роты паказалі сапраўды авангардную ролю асабістым прыкладам у баявой рабоце па выкананьні загаду камандзіра.

Войска дзейнічае бесьперапынна. «Чырвоныя» з боем вялі разьведку ў глыбіню абароны. А 18-й гадзіне 4-я і 5-я роты Н-скага палка рашучай атакай адбілі часьці «сініх» і заняли паўднёвую акраіну мястэчка. «Сінія» арганізаваўшы контр-удар прымусілі «чырвоных» адыйсьці з вялікімі стратамі на былыя пазыцыі. У той-жа час дзьве роты Н-скага палка «чырвоных» фарсыруючы раку і таксама атакоўваючы праціўніка, занялі пазыцыю М-скага палка, прасьледуючы «сініх». 4-я рота гэтага-ж палка мела посьпехі на суседнім вучастку. Да вечара 4-я і 5-я роты зноў пераправіліся праз раку. 25-га верасьня раніцой «чырвоныя» працягвалі наступленьне. З набліжэньнем канца манэўраў з кожным днём і гадзінай ўзьнімаецца старанна сьць байцоў і начсклад, узрастае зацікаўленасьць іх баявымі дзеяньнямі. (Белта).

Усё вышэй і вышэй Чырвоны паветраны флёт

РАЁН МАНЭЎРАЎ. 26-IX. Трэці этап манэўраў паказвае новыя дасягненьні авіяцыі абодвых бакоў. Авіяцыя «чырвоных» адменна справілася з задачай разьведваньня групоўкі сіл «праціўніка» на фронце і правадзімых работах па абсталяваньні абарончай паласы «сініх».

Ударная экскадрыльля зрабіла магутны налёт на выкрытыя конныя часьці «праціўніка», пасьпяхова выканаўшы баявыя дзеяньні ў надзвычайна цяжкіх мэтэаралёгічных умовах. Гэтая эскадрыльля ў часе дажджу пасьпяхова пераляцела на другі аэрадром.

23-га верасьня авіяцыя забясьпечыла энэргічнае наступленьне свайго войска, абараняючы яго ад авіяцыі «праціўніка».

Уначы авіяцыя вяла разьведку ўмацаванай паласы «праціўніка», шляхоў зносін і тылу, пасьля чаго разбурыла іх бамбардзіроўкай.

Гэтыя дні паветраны флёт працаваў пры выключна цяжкіх уморах надвор'я, нізкай воблачнасьці, туманах, дажджох .На гледзячы на гэта разьведка давала каштоўныя весткі аб перагрупоўцы «праціўніка», аб складзе перасоўваючыхся і зьбіраючыхся яго часьцях.

Пры разборы другога этапу манэўраў галоўны кіраўнік тав. Убарэвіч, ацэньваючы працу авіяцыі, сказаў: «работа авіяцыі абодвых бакоў зусім здавальняючая. Добрыя атакі зьнішчальнікаў, вельмі добра наладжаны атакі на наземнае войска. Патрэбна яшчэ большая тактычная пісьменнасьць лётнага складу.

Пасьпяховая праца авіяцыі забясьпечваецца вялікай палітычнай працай паліторганаў усіх ступеняй і авангардная роля кожнага камуніста і камсамольца. (Белта).

Раўненьне па эскадрону т. Сяргеева

РАЁН МАНЭЎРАЎ. 25-IX. Эскадрон пад камандаваньнем тав. Сяргеева меў задачу правесьці разьведку.

Эскадрон дзейнічаў у шырокай паласе (ад 4-х да 6 кілёмэтраў), што патрэбавала ад камандзіра вялікай ініцыятывы і находчывасьці, а ад байцоў нястомнасьці ў дзейнічаньні.

Актыўным правядзеньнем разьведкі эскадрон выкрыў «праціўніка». Рашчоўнай атакай «разьбіў» стралковую, кулямётную,сапёрную роты, батарэю «праціўніка», захапіў абоз і штаб стралковага батальёну разам з важнымі апэрацыйнымі дакумантамі.

Пазьней, у другім раёне, таксама былі захоплены апэрацыйныя дакументы і лініі «праціўніка». У часе разьведкі, ня гледзячы на дрэннае надвор'е і цяжкія ўмовы прасоўваньня па лясістай і забалочанай мясцовасьці, конькі працавалі па ўдарнаму. Самыя адказныя даручэньні бліскуча выконвалі ся партыйцамі і камсамольцамі. Знаходзячыся ў разьведцы эскадрон ўвесь час праз «фронт» трымаў сувязь з камандаваньнем палка.

У наступны дзень эскадрон т. Сяргеева будучы ва ўдарнай групе палка, дзейнічаўшы актыўна і ініцыятыўна, сваячасова атакаваў на правым і левым флянгах абцякаючыя часткі «праціўніка», чым садзейнічаў усяму палку выканаць задачу.

Камандаваньне палка за ўзорную работу абвесьціла падзяку ўсяму чырвонаармейскаму і начальніцкаму складу эскадрона. (Белта).

Рапарт шэфам

№-скі чырвонаштандарны кавалерыйскі полк адзін з лепшых у дывізіі, паслаў сваім шэфам — абутковай фабрыцы і друкарні імя Сталіна рапарт наступнага зьместу:

Пастаўленыя задачы на час манэўраў полк выконвае па-ўдарнаму. Мінуўшыя дні манэўраў паказалі высокае палітыка-маральнае становішча байцоў і начскладу, імкненьне наперад да пасьпяховага выкананьня манэўраных задач.

У палку маюцца ўзоры сапраўднай ударнай бальшавіцкай работы т. т. Зоткіна, Сяргеева, Коба, Леўчука, Завіруйка і раду іншых.

За манэўраны пэрыяд у партыю падана 57 заяў, у камсамол—19, у калгасы—7.

Полк шырока растлумачвае насельніцтву генэральную лінію партыі. Па гэта сяляне адказваюць арганізацыяй чырвоных абозаў, уступленьнем у калгасы.

Байцы і начсклад запэўніваюць сваіх шэфаў, што пад кіраўніцтвам начскладу і партарганізацыі полк узорна выконвае ўсе пастаўленыя перад ім задачы на манэўрах.

Ваенком ТКАЧЭНКА

Сакратар парткалектыву ПАЎЛАЎ

9.000 рабочых Данбасу

ЯШЧЭ 4 ДНІ

засталося да 1 кастрычніка—тэрміну выкананьня пляну вярбоўкі. Гэтыя 4 дні павінны быць ударнымі днямі вярбоўкі

„Партарганізацыі Беларусі павінны зламаць апартуністычнае супраціўленьне вярбоўкі рабочай сілы для Данбасу, ударнымі тэмпамі разгарнуць вярбовачную работу, поўнасьцю і ў тэрмін выканаць заданьне па вярбоўцы рабочай сілы для ўсесаюзнай качагаркі" („Правда" 24 верасьня 1931 г.)

На 20 верасьня завербавана	З 20 па 25 верасьня завербавана
4.676 рабочых	**2.289 рабочых**

Усяго да 25 верасьня завербавана

6.965 рабочых або 77,4 пр.

Па ўдарнаму завяршыць вярбоўку

Чарговае паседжаньне Цэнтральнай камісіі садзейнічаньня вярбоўцы рабочай сілы для Данбасу, якое адбылося 25-га верасьня, абгаварыла становішча ходу вярбоўкі па БССР. Паводле апошніх тэлеграфных вестак на 25-IX, з БССР на Данбас накіравана ўсяго 6.965 чал., што складае 77,4 процанты агульнага пляну, які павінен быць выкананы да 1-га кастрычніка.

Па аб'яднаньні «Вугаль» завербавана і накіравана на работу 4.482 чал., або 89,6 проц. пляну, па трэстах Данбасжылбуду і Ужрылбуду—1.483 чал. ці 37 проц. пляну.

Як і раней вельмі слаба разгорнута мабілізацыя камсамольцаў для Данбасу. На 25-IX мабілізавана замест 1.000 камсамольцаў толькі 269. З 15 раёнаў, па якіх разьвёрстана кантрольная лічба мабілізацыі камсамольцаў, толькі 4 раёны (Лепельскі, Ельскі, Жлобінскі і Крупскі) выканалі заданьне.

Астатнія 11 раёнаў ня толькі ня выканалі кантрольных лічбаў, але нават не інфармуюць ЦК ЛКСМБ аб ходзе гэтай работы. Сакратарыят ЦК ЛКСМБ 21-IX вынес пастанову, у якой ён пад асабістую адказнасьць сакратароў РК абавязаў камсамольскія арганізацыі адстаючых раёнаў выканаць не пазьней 28-га верасьня даныя ім заданьні.

Такім чынам, БССР павінна за апошнюю пяцідзёнку, да 1-га кастрычніка, даць Усесаюзнай качагарцы яшчэ 3.035 чал., калі ня лічыць сустрэчных плянаў асобных раёнаў.

Лічбы апошніх дзён сьведчаць аб тым, што тэмп вярбоўкі, які быў узят у другой дэкадзе верасьня, у апошні час здаецца.

Калі раней мы мелі штодня адпраўку 300—400 чал., дык у апошнія дні на Данбас з БССР накіроўваецца толькі 200 чал. у сярэднім.

Значная частка раёнаў дагэтуль яшчэ плятуцца ў хвасьце вярбоўкі.

У Прапойскім раёне (плян 250 чал., накіравана на Данбас 24) вярбоўка пачалася толькі 17-IX, г. зн. з часу прыезду ў раён упаўнаважанага Наркампрацы. Да гэтага часу раённыя арганізацыі ня стукнулі палец аб палец для разгортваньня вярбоўкі. Нават паказаньні па гэтым пытаньні ня былі даны ні партячэйкам, ні сельсаветам, ні калгасам. Штаб садзейнасьці, які быў раней створаны, не працаваў, а існаваў толькі на паперы.

Прыблізна такое становішча наглядаецца і ў Рэчыцкім раёне. Тут трэба толькі адзначыць, што РК ЛКСМ па-баявому ўзяўся за гэту справу і паслаў у розныя сельсаветы раёну, для дапамогі ў правядзеньні вярбоўкі, 12 камсамольцаў. РК КП(б)Б не паслаў ніводнага чалавека.

Некаторыя сельскія арганізацыі раёну ня толькі не дапамагаюць вярбоўцы, а аказваюць нават супраціўленьне. Так, старшыні Вашаміраўскага с-с. і калгасу імя Сталіна адмовіліся адпусьціць на работу ў Данбас завербаваных калгасьнікаў.

Буда-Кашалёўскі раён замест 240 чал., ня даў ніводнага. Да апошняга часу раённыя арганізацыі стаялі ў баку ад вярбоўкі. Толькі некалькі дзён таму назад пленумы РК КП(б)Б і РВК, прызнаўшы бязьдзейнасьць раённых і сельскіх арганізацый у гэтай справе, вынесьлі пастанову аб максымальным разгортваньні вярбоўкі. Пленумы РК КП(б)Б і РВК пастанавілі правесьці ў раёне дэкаднік штурму прарыву.

Ня ў лепшым, а нават значна ў горшым становішчы знаходзяцца Чырвона-Слабодзкі, Стара-Дароскі, Лагойскі, Быхаўскі і Брагінскі раёны, якія не накіравалі на Данбас ніводнага чалавека, і якія занесены на чорную дошку.

Цэнтральная камісія адзначыла, што Талачынскі раён, які з 200-х чалавек, накіраваў у Данбас 132 чал. і Глускі—з 320 чал.—154, пры разгортваньні баявых тэмпаў работы могуць прэтэндаваць на прэміяваньне. Цэнтральная камісія садзейнічаньня парашыла прэміяваць наступныя раёны, якія выканалі і перавыканалі кантрольныя лічбы вярбоўкі: Ельскі раён, які замест 125 чал. накіраваў на Данбас 155 чал., Касьцюковіцкі замест 350 чал. даў 530 чалавек, і Хойніцкі (100 проц. пляну) раёны. Касьцюковіцкі раён прэміяваны 1.000 рублямі, Хойніцкі—750 руб., Ельскі—500. Апроч таго, прэміяваны 150 рублямі студэнт камвузу імя Леніна тав. Мацюхін, які зьяўляецца грамадзкім вярбоўшчыкам. Тав. Мацюхін сваёй работай у Лепельскім раёне дасягнуў выкананьня кантрольнай лічбы вярбоўкі ў гэтым раёне.

Кандыдатамі на прэміяваньне намечаны наступныя раёны: Клімавіцкі, Крычаўскі, Петрыкаўскі, Чачэрскі, Рагачэўскі.

С. Гр-ў.

З дзесяці--ніводнага

Рудзенскі сельсавет (Пухавіцкі раён) павінен быў даць 10 рабочых для Данбасу ,але на сёньняшні дзень ніводнага адыходніка ня даў.

Калгасы «Новы шлях» і «Вясёлае жыцьцё», якія маюць лішкі рабочай сілы, адмаўляюцца выконваюць разьвёрстку райкалгассаюзу.

Рыг. Асака.

Конкурс на лепшы прыём завярбованых у Данбас

Абвешчаны ўседанецкі конкурс на лепшы прыём і замацаваньне прыбываючых адыходнікаў.

Шахты адна за аднэй ўключаюцца ў конкурс. Арганізуюцца вечары-сувязі кадравых рабочых з навічкамі. Калгасьнікі на гэтых вечарох абяцаюць упарта змагацца за выкананьне вугальнай праграмы.

Ударныя брыгады правяраюць стан баракаў, дамагаюцца адкрыцьця новых сталовых і іншых культурна-бытавых устаноў.

«Р».

Замест 125—11

Талачын (Наш кор.). З Талачынскага раёну ,згодна заданьня, у Данбас павінна быць паслана 125 чалавек. Накіравана-ж фактычна толькі 11. Асноўную прычыну правалу пасылкі ў Данбас трэба шукаць у тым, што ўпаўнаважаны па вярбоўцы рабочай сілы ў Талачынскім раёне не правёў ніякай масавай работы сярод насельніцтва. Ён чакае пакуль «прыдуць рабочыя, каб запісацца».

Калгасы Талачынскага раёну таксама адстаюць у пасылцы рабочых на Данбас.

Арэшкаў.

Забясьпечыць прамысловасьць драўнінай і апалам

Па прыкладу лепшых выканаць і перавыканаць плян лесазагатовак і вывазкі

Адстаючых не павінна быць!

Па прыкладзе лепшых усе леспрамгасы БССР павінны выканаць пляны дровалезагатовак вывазкі

Паводле апошняй зводкі Лесбелу на 21-IX—г. г. гадавы плян па дровалесазагатоўках выканан леспрамгасамі БССР: па дровах на 34,3 проц., па дзелавой драўніне—на 78,9 проц.

Плян вывазак выканан: па дровах на 44,1 проц., па дзелавой драўніне—на 58,8 проц.

Мы маем рад леспрамгасаў, якія значна перавыканалі пляны загатовак, асабліва дзелавой драўніны: Віцебскі леспрамгас—134,2 проц., Калінкавіцкі—132,1, Гомельскі—130,4, Бешанковіцкі—123,6, Аршанскі—121,2 Магілёўскі—109,9, Полацкі—108,3, Асіповіцкі—106,9 і Горацкі—105,7 проц.

Але калі ў справе загатовак дзелавой драўніны гэтыя леспрамгасы пакалі сапраўды бальшавіцкія ўзоры работы, дык у выкананьні пляну загатовак дроў большасьць з іх адстае. Акрамя Віцебскага леспрамгасу, які выканаў плян дровазагатовак на 110,9 проц., і Магілёўскага—108,8 ніводзін з пералічаных леспрамгасаў і астатніх леспрамгасаў БССР ня выканалі дровазагатоўчых плянаў.

Яшчэ горш стаіць справа з вывазкай загатоўленай драўніны і дроў. Апроч Віцебскага леспрамгасу, які выканаў плян вывазкі дроў—на 126,4, ніводзін леспрамгас пляну вывазак ня выканаў.

Ёсьць рад леспрамгасаў ,якія ўвесь час гаечна цягнуцца ў хвасьце па выкананьні плянаў сваёй работы:

Назва леспрамг.	Загатоўкі: У проц. да гад. пляну: дроў	Загатоўкі: У проц. да гад. пляну: дзел. драўн.	Вывазкі: У проц. да гад. пляну: дроў	Вывазкі: У проц. да гад. пляну: дзел. драўн.
Бярэзінскі	9,5	48,9	32,4	53,9
Хойніцкі	9,8	86,9	36,6	46,4
Боркавіцкі	15,7	60,7	28,2	38,4
Глускі	17,4	48,8	25,4	41,9
Тураўскі	17,5	48,2	17,7	42,8
Рэчыцкі	19,2	71,2	31,2	58,3
Чачэрскі	22,3	67,5	29,4	54,9
Уборыцкі	23,1	71,3	82,2	64,7
Бабруйскі	23,2	70,1	28,9	49,9
Чэрвеньскі	24,6	63,3	77,4	47,8

Мы паказалі толькі нязначную частку, найбольш адстаючых леспрамгасаў. Усе астатнія леспрамгасы БССР, акрамя тых перадавых, аб якіх мы гаварылі вышэй, таксама яшчэ ня выканалі сваіх плянаў ні па загатоўцы, ні па вывазцы дзелавой драўніны і дроў.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што значная большасьць леспрамгасаў БССР не ўзялі яшчэ баявых тэмпаў работы, не мабілізавалі грамадзкасьць на выкананьне плянаў забясьпячэньня прамысловасьці і працоўнага насельніцтва сыравінай і апалам, не арганізавалі працу на брыгадным мэтадзе.

Лічбы выкананьня плянаў перадавымі леспрамгасамі зусім яскрава сьцьвярджаюць поўную рэальнасьць плянаў і магчымасьць іх выкананьня. Асноўнай прычынай невыкананьня плянаў астатнімі леспрамгасамі зьяўляецца непаваротлівасьць і бязьдзейнасьць саміх леспрамгасаў.

Партыя і ўрад неаднакраць давалі зусім выстарчальныя дырэктывы аб неабходнасьці фарсаваньня выкананьня плянаў дровалесазагатовак і вывазкі. Толькі пры ўмове неадкладнага і правільнага ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў, пры рашучым павароце леспрамгасаў і раённых арганізацый да задач забясьпячэньня прамысловасьці і працоўнага насельніцтва сыравінай і апалам, пляны могуць быць і будуць выкананы.

С. Г.

Зьвесткі аб руху сплаву па Лесбеле на 20 верасьня 1931 г.

Падвезена на 20-IX 1931 г. 2.680.856 к. м., што складае 62,5 проц. да пляну.

З колькасьці падвезенай драўніны здана спажыўцом на прыстанях будаўнічага лесаматар'ялу 18.851 к. м., што складае 2,1 проц. да пляну і 3,2 проц. да падвезенага.

Дынаміка сплаву:

	Проц. выкан. да пляну.
Пушчана ў сплаў	59,4
Прыбыло да канечн. пункту	50,4
Знаходзіцца ў сплаве	9
З прыбыўш. выгружана	15,9

Па сплаўных канторах

Сплаўн. канторы	Пушчана ў сплаў проц. да пляну	Прыбыло да канечн. пункту проц. да пляну
Гомель	61,3	57 3
Бабруйск	66,4	53,2
Віцебск	64,2	60,6
Мазыр	60,5	29,5

Максымальна ўзьняць тэмпы завозу дроў у Менск

Згодна пастановы партыйных і ўрадавых органаў у Менск, з 1-V да 1-X трэба завезьці 10.500 вагонаў дроў. Гэтая лічба разьвёрстана па наступных леспрамгасах: Асіпавіцкі—3400 вагонаў, Глускі—3800, Бабруйскі—1300, Калінкавіцкі—1000, Петрыкаўскі—1000.

На 15-IX з паказанай колькасьці ў Менск завезена 3400 вагонаў дроў. Паводле пастановы ўраду ў Менск штодзень павінна завозіцца 100 вагонаў дроў. Да верасьня паступала ў сярэднім 15-20 вагонаў у дзень, а ў верасьні прыбывае ў сярэднім 50 вагонаў.

Чым-жа тлумачыцца такі значны прарыў? Асноўнай прычынай прарыву зьяўляецца тое, што ні леспрамгасы, ні райвыканкомы, ні сельсаветы не павярнуліся яшчэ тварам да задач лесазагатовак і стварэньня належных умоў працы лесарубаў. Рабочыя і гужавая сіла выкарыстоўваецца нерацыянальна. Дырэктывы партыі і ўраду аб адыходніцтве і арганізаваным наборы рабочай сілы не даведзены да шырокіх мас калгасьнікаў і беднякоў, серадняковаў. Часам аб гэтых дырэктывах партыі і ўраду ня ведаюць старшыні сельсаветаў і дзесятнікі. З боку райкомаў партыі і райвыканкомаў няма сталага, жорсткага кантролю і кіраўніцтва работай леспрамгасаў.

Лясная каапэрацыя, створаная выключна для палепшаньня абслугоўваньня патрэб лесарубаў, мала клапоціцца аб выкананьні сваіх задач: грамадзкае харчаваньне не наладжана, патрэбных прадуктаў харчаваньня і прамтавараў для прэміяваньня лепшых ударнікаў—лесарубаў няма, дырэктыва партыі аб адчыненьні ларкоў ня выконваецца і г. д.

Нельга абыйсьці моўчкі становішча ўласнага гужавога транспарту Лесбелу, які налічвае на сёньняшні дзень 3300 коняй. Гэты транспарт скарыстоўваецца нерацыянальна, а ў некаторых леспрамгасах проста злачынна. Пры праверцы работы транспарту ў Асіпавіцкім леспрамгасе аказалася, што на некаторых вучастках 40 проц. коняй прастойваюць без работы, ці выкарыстоўваюцца не па прызначэньні. У Лапіцкім вучастку, напрыклад, з 70 коняй—24 проц. скарыстоўваюцца для розных разьездаў служачых.

Зусім зразумела, што пры належным кіраўніцтве з боку дырэктараў леспрамгасаў і раённых арганізацый, пры рабоце па новаму, гэтых агідных зьявішч і прарываў у выкананьні лесазагатоўчых плянаў ня было-б.

Новае кіраўніцтва Лесбелу павінна забясьпечыць перабудову работы ўсёй сваёй сыстэмы зьверху да нізу на новыя мэтады, на баявыя тэмпы, што дасьць магчымасьць выканаць і перавыканаць пляны забесьпячэньня прамысловасьці і працоўнага насельніцтва драўнянай сыравінай і апалам.

Левін.

Прэміраваць лепшых

У калгасе «Кастрычнік» Лоеўскага раёну падпіскай на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі» зхопле..а 85 пр. калгасьнікаў. У сярэднім кожны калгасьнік падпісаўся на суму звыш 26 руб. Некаторыя калгасьнікі падпісаліся на 50-80 руб.

Падпіска на пазыку працягваецца.

Неабходна, каб сельская камісія садзейнічаньня паставіла пытаньне аб прэміраваньні таварышоў, якія пасьпяхова правялі падпіску на пазыку па гэтаму калгасу.

Мігуцкі С., Сямёнава Н.

Саветы БССР павінны ўключыцца ў агляд

работы саветаў і конкурс на лепшае правядзеньне справаздачнай кампаніі

Сёньня ў масавым аглядзе работы саветаў удзельнічаюць раёны: Мсьціслаўскі, сельсаветы: Беладубраўскі, Красьніцкі, Негінскі і Курманаўскі

Праверка работы саветаў і самая справаздачная кампанія павінны яшчэ больш узьняць ролю саветаў, як праваднікоў і барацьбітоў за генэральную лінію партыі, узмацніць саветы, як органы пралетарскай дыктатуры, яшчэ больш замацаваць кіруючую ролю рабочае клясы ў сацыялістычным будаўніцтве (З пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР)

Сваячасова падрыхтаваць справаздачную кампанію саветаў

З часу перавыбараў саветаў ўжо прайшло паўгода. Паводле палажэньня пра выбары ў саветы, саветы абавязаны праз кожныя 6 месяцаў рабіць справаздачы. Завяршэньне перабудовы работы саветаў патрабуе папярэдняй праверкі ўсяе работы саветаў.

У час гэтай кампаніі кожны дэпутат савету, сэкцыя, дэпутацкая група і г. д. павінны сказаць, як яны практычна праводзілі генэральную лінію партыі, як яны выконвалі задачы, пастаўленыя перад саветамі.

Больш поўнае асьвятленьне дзейнасьці саветаў патрабуе сталай падрыхтоўкі да гэтай кампаніі. Гэта работа павінна быць ператворана ў масавую кампанію ўсіх саветаў. **Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў правесьці гэту кампанію па ўсёй БССР з папярэднім аглядам работы саветаў, пачаўшы з 10-га па 20-га кастрычніка, сама-ж справаздачная кампанія вызначана з 20-га кастрычніка па 10-га лістапада.** У гэтай пастанове ЦВК БССР даў выразную ўстаноўку аб агульных задачах кампаніі.

Зараз на мясцох патрэбна шырока разгарнуць падрыхтоўку да справаздачай кампаніі. Тэрміны ўстаноўленыя дастатковыя для таго, каб добра падрыхтаваць, арганізавана правесьці гэту кампанію. Выпадковасьць, «аб'ектыўныя прычыны» павінны быць рашуча адхілены. Справаздачную кампанію саветаў нельга праводзіць габінэтным парадкам, як гэта думаў правесьці Полацкі гарсавет. **Шырокая падрыхтоўка, уцягненьне шырокіх мас выбаршчыкаў у гэту кампанію—вось што павінна ляжаць у аснове плянаў яе правядзеньня.**

Зараз патрэбна ўжо прыступіць да складаньня каляндарных плянаў масавага агляду работы саветаў і справаздачай кампаніі. Праз мясцовы друк трэба шырока абвясьціць выбаршчыкаў аб правядзеньні кампаніі. Трэба арганізаваць спэцыяльныя брыгады з ударнікаў рабочых, калгаснікаў, батракоў, беднякоў і серадняко́ў-аднаасобнікаў для масавага агляду работы саветаў.

На падставе папярэдняга агляду, брыгады намячаюць мерапрыемствы для завяршэньня перабудовы работы саветаў, шырока разгортваючы вахол работы саветаў і работы асобных чле́наў крытыку і самакрытыку. **Трэба арганізаваць самы шырокі ўдзел працоўных мас на ўзмацненьне работы саветаў і выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній.** Прафсаюзы, камсамол поўнасьцю павінны быць уцягнуты ў правядзеньне гэтай кампаніі. Трэба разгарнуць шырокую прапаганду, прыцягнуўшы да гэтага хатычытальні, клюбы, якія павінны арганізаваць у форме выстаўкі, дыяграм і г. д. шырокі паказ канкрэтных дасягненьняў у рабоце саветаў, выявіць канкрэтна асобныя недахопы гэтай работы, канкрэтных вруўшчыкаў работы. **Асаблівую ролю ў арганізацыі паказу работы саветаў павінен адыгрываць друк—райгазэты, шматтыражкі і насьценгазэты.**

Саветы і мясцовыя арганізацыі павінны на ўсе справаздачныя сходы забясьпечыць стопроцантную явку выбаршчыкаў. Для больш поўнага забясьпечаньня ў справаздачай кампаніі ўдзелу жанчын, трэба арганізаваць для дзяцей часовыя ясьлі, пасылку жанчынам спэцыяльных запрашэньняў на сходы жанчын, арганізаваць брыгады нянек.

Асаблівы ўдзел у аглядзе работы саветаў і справаздачай кампаніі павінны прыняць чырвонаармейскія часьці. Саветы павінны шырока перад чырвонаармейцамі асьвятляць сваю работу і тыя задачы, якія стаяць перад саветамі ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і баяздольнасьці Чырвонай армії. Асабліва ў справаздачах павінны быць выяўлены канкрэтныя мерапрыемствы па аказаньні дапамогі Чырвонай армії.

У правядзеньні справаздачай кампаніі саветаў павінна быць улічана поўнае абслугоўваньне нацменшасьцяй на іх роднай мове—арганізацыя дакладаў агляду работы нацсаветаў, позвы і іншыя мерапрыемствы, якія-б спрыялі больш шырокаму наведваньню працоўнымі нацменшасьцямі справаздачных сходаў.

Па ўсім ходзе справаздачай кампаніі чырвонай стужкай павінна прайсьці клясавая пільнасьць і рашучая барацьба з розными праявамі варожых элемэнтаў.

Уся справаздачная кампанія павінна быць праведзена ў разрэзе ўзмацненьня ролі саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту. Таму асаблівую ўвагу трэба таксама аддаць узмацненьню дзейнасьці сэкцый саветаў, дэпутацкіх груп, арганізацыі дэпутацкіх груп у саўгасах і калгасах.

На мясцох зараз-жа патрэбна разгарнуць шырокую падрыхтоўчую работу, поўнасьцю забясьпечыць прадстаўленьне ЦВК інфармацый аб ходзе гэтай работы.

Трэба памятаць, што ад таго, як будзе праведзена падрыхтоўка—будуць залежыць посьпехі справаздачнай кампаніі і, такім чынам, і ўзмацненьне работы саветаў.

П—н.

Масавы агляд работы саветаў

Беладубраўскі, Красьніцкі і Негінскі сельсаветы ў радох перадавых

Перабудаваць работу саветаў—значыцца быць на чале калгаснага руху, кіраваць калгаснай вытворчасьцю, узмацніць ролю саветаў як органаў пралетарскай дыктатуры. Гэтую ролю саветаў правільна ўявілі сабе некаторыя сельскія саветы Касьцюковіцкага раёну: **Беладубраўскі, Красьніцкі і Негінскі.**

Бальшавіцкая настойлівасьць за выкананьне генэральнай лініі партыі, упартая барацьба з кулацкімі элемэнтамі дало магчымасьць гэтым сельсаветам прысьці ў асноўным да суцэльнай калектывізацыі. **Беладубраўскі сельсавет калектывізаваны на 81,6 проц., Красьніцкі—90,2 проц. і Негінскі—76 проц.**

Шырака разгорнутая масавая работа дала значны новы прыліў у калгасы у трох сельсаветах. Усю гэту масавую работу саветы зьвязалі з гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, як веснавая сяўба, вучот аб'ектаў абкладаньня і г. д. Негінскі сельсавет сыстэматычна праводзіў канфэрэнцыі беднаты, калгаснікаў і вясковага актыву. Абапіраючыся на беднату ў саюзе з серадняком **Красьніцкі сельсавет** правёў суцэльную калектывізацыю ўсяго сельсавету на 90,2 проц.

Арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў зьяўляецца ў сучасны момант баявой задачай саветаў. У практыцы работы Беладубраўскага сельсавету, кіраўніцтва калгасамі ажыцьцяўляецца праз заслухоўваньне дакладаў калгасаў па асобных галінах працы. Ад кіраўніцтва «наогул» адмовіўся. Канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю пакладзена ў аснову работы. Гэта падцьвярджаецца тым, што на ўсякія хваравітыя зьявішчы ў калгасах сельсавет рэагуе нават да тэрміновай пасылкі прыгад ад сельсавету на ліквідацыю прарываў. Гэту магчымасьць Негінскі сельсавет апрымаў таму, што ён прымацоўваў да калгасаў сяброў савету, сельскі актыў. Сябры праўленьня больш буйных калгасаў зьяўляюцца нават сябрам прэзыдыуму.

Беладубраўскі савет вылучае актыў для агляду работы калгасаў і дапамогі ім. Пры разглядзе пытаньняў будаўніцтва калгасаў на прэзыдыуме ўдзельнічае калгасны актыў. Калгасы Беладубраўскага сельсавету спаборнічаюць паміж сабою на лепшае правядзеньне палітычна-гаспадарчых кампаній. Пры актыўных удзеле савету праводзіцца зьдзельшчына, распрацоўваюцца вытворчыя пляны.

Сельсаветы на сваім шляху сустракалі шалёнае супраціўленьне кулацтва нават унутры калгасаў. Праводзячы арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, саветы праводзілі цьвёрдую клясавую лінію,—ачышчалі калгасы ад кулацкіх элемэнтаў з адначасовым узмацненьнем палітыка-выхаваўчай работы сярод батракоў, бядняцка-серадняцкіх мас калгаснікаў.

Усе гэтыя дасягненьні—вынік правільнага наладжаньня масавай работы сэкцый саветаў. Кожная сэкцыя праводзела сваю работу па пляну. Пленумы савету наведвала 80-90 проц. членаў савету, а ўдзелам актыву. Гэтыя пасяджэньні праводзіліся ў большай частцы ў калгасах. Для правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній, сельсаветы практыкавалі папярэднюю арганізацыю брыгад па паасобных заданьнях. Шырака прапрацаваны на нарадах і ў калгасах пастановы партыі і ўраду па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Беднота па перадавых сельсаветах Касьцюковіцкага раёну ўлічана і ўцягнута ў калгасы за выключэньнем 20 гаспадарак, якія да гэтага часу знаходзяцца пад уплывам сваіх сваякоў—кулакоў і заможнікаў. Групы беднаты ўдзельнічаюць у прапрацоўцы раду мерапрыемстваў і самі практычна ўдзельнічаюць у ажыцьцяўленьні іх.

Гэта можна характарызаваць наступнымі данымі **па выкананьні плянаў у адносінах да гадавога заданьня на 15 верасьня ў проц.:**

Назва сельсавету	Розн. збожжа	Сена	Салома	Б. раг. жыв.	Сьвіньні	Авечкі	Цяляты
Красьніцкі . . .	55	40	28	90	76	104	101
Негінскі . . .	54	70	41	117	75,2	38	102
Б. Дубраўскі . . .	71	60	47	96,5	74	87	82

Па мабілізацыі сродкаў у проц.

	С.-г. падат.	Страхоўка	Пазыка 3-га рашаючага
Красьніцкі . . .	36	28	102
Негінскі . . .	40	39	87
Б. Дубраўскі . . .	48	44	82

На чале гэтых мерапрыемстваў стаяць калгасы. Асобныя калгасы **Беладубраўскага** савету амаль поўнасьцю выканалі свае пляны загатовак праз чырвоныя абозы.

Посьпехі бясспрэчны. Паказаныя сельсаветы сталі на верны шлях. Аднак зусім нельга пакідаць у баку і тыя недахопы, якія маюцца ў працы гэтых сельсаветаў.

У асобных выпадках зьмяншаецца роля сэкцый, ім не даюцца пляны на папярэдні разбор, стварацца абязьлічка. Зусім недастаткова працуюць сэкцыі па палепшаньні быту жанчын. На Негінскім і Красьніцкім сельсаветах не наладжана работа груп беднацы, няма сталых кіраўнікоў гэтых груп.

Арганізацыйна-гаспадарча замацоўваючы калгасы, патрэбна рашуча выкарчаваць рэшткі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі. Лік відацыя недахопаў у рабоце с.-с. Касьцюковіцкага раёну павінна стаць чарговай задачай. Трэба дабіцца цьвёрдай плянавай работы сэкцый у саветах, арганізацыі праз гэтыя сэкцыі групы дэпутатаў у калгасах, якія павінны зьяўляцца асноўнымі дапаможнікамі арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў. Безаддадна павінна быць узмоцнена кіраўніцтва групамі беднаты.

Партячэйкі больш сыстэматычна павінны правяраць работу кіраўнікоў груп ,накіроўваць работу груп беднаты на вырашэньне канкрэтных задач. Увесьці плянавасьць у работу гэтых груп.

Абапіраючыся на шырокі сельскі калгасны актыў, пад кіраўніцтвам мясцовых партарганізацый, ліквідуючы недахопы, **Беладубраўскі, Красьніцкі, Негінскі** сельсаветы пакажуць яшчэ лепшыя прыклады сваёй работы. П-н.

Ліквідаваць прарыў у Мсьціслаўскім раёне

У Мсьціслаўскім раёне яшчэ ня ўбрана 2.000 га лёну. Плян цераблепьня, расьцілу і замочкі лёну выкананы па раёне на 20 проц. На ліквідацыю гэтых прарываў прамадэкасьць не мабілізуецца.

3.000 га сенажаці па раёне застаецца на корані на зіму. Гэта ў той час, як мінулы год калгасы цярпелі бяз корму. У калгасе «Луч Кастрычніка» ў мінулым годзе засталося 10 га нескошанага лугу. У гэтым годзе таксама такая-ж колькасьць сенажаці ня скошана.

Прадстаўнік раёну тав. Казлоў, які цэлае лета праседзеў у гэтым калгасе, дадумаўся да «новых мэтадаў». У калгасе зараз абраны два старшыні т. т. Усімаўскі і Канатаў. Калгаснікі больш ходзяць да гэтых старшынь па розныя загады, чым займаюцца карыснай работай.

Земчастка займалася ачкоўціраньнем у падачы вестак цэнтральным установам. Напрыклад, даваліся весткі аб тым, што сена ўбрана на 100 проц., у той час як 5.000 га сенажаці стаяць неўбранымі. Загадчык земчасткі таварыш Шэвэльдзін гэта тлумачыць неяк па-свойму: «юрыдычна» ў нас скошана, а фактычна не, таму, што сенажаці сапраўды аказалася больш як на паперы».

Прыкладнае разьмеркавальне ўраджаю па раёне яшчэ ні ў адным калгасе не праведзена. Калгас «Пераможца» разьмеркаваў ураджай па дварох калгаснікаў пароўну.

Тэрмін сканчэньня сяўбы па раёне даўно прайшоў, але яшчэ не засеяна больш 5.000 га. Пашырэньне азімага кліну праводзіцца за кошт яравога кліну, у той час як у Пячонкаўскім сельсавеце больш 200 га кулацкай зямлі трэці год пустуе.

Раён мае значныя прарывы і ў хлебазагатоўках. У гэтым напрамку шмат якія сельсаветы робяць «лявацкія» перагібы. Цьвёрдыя заданьні даюцца сераднякам. Так, напрыклад, у Курманаўскім сельсавеце дана цьвёрдае заданьне па загатоўках кулаку Лысянкову і гэткае-ж заданьне серадняку Шкурававу Арцёму з в. Старыны.

Па ўсім раёне плян загатовак выканан усяго на 20 проц. Чырвонага абозу раён яшчэ ня бачыў.

Яшчэ адзін прарыў у раёне—гэта сканчэньне будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах. У саўгасе «Чырвоны Сьцяг» патрэбна паставіць да 1-X—31 г.—320 сьвіней, 120 кароў, 90 коняй і г. д. Плян укамплектаваньня жывёлай выконваецца, але жывёла да гэтага часу стаіць пад адкрытым небам. Дырэктар саўгасу таварыш Маляўкін кожны дзень піша ў адпаведныя гаспадарчыя органы, а таксама ў РВК і ў Райком партыі, а нараду на лесаматар'ялы яшчэ не атрымана. 29-га жніўня саўгас пасылае нарочным у белкантору «Сьвінаводтрэсту» пошта-тэлеграму такога зьместу: «будаўніцтва распачата ва ўсю. Людзі ёсьць. Няма лесаматар'ялу. РВК на нашы запатрабаваньні нічога не адказвае, адмаўляючыся тым, што ён гэтым ня кіруе. Райком раіць зварочвацца ў Менск. Белбуд не рэагуе.».

Ёсьць выпадкі, калі беднякі выключаліся з калгасу за тое, што працавалі ў саўгасе. На іх скаргі старшыня райкалгассаюзу, Дамброўскі адказвае: «добра зрабілі, што выключылі». Такіх заяў у райкалгассаюзе больш 100. Ва ўсіх заявах скаргі на незаконныя выключэньні з калгасаў і на засьмечанасьць калгасаў клясава-чужым элемэнтам.

Старшыня Курманаўскага сельсавету т. Кабанаў на запытаньне чаму ў праўленьні калгасу столькі кулакоў, адказвае прэзыдыуму РВК: «няма з каго выбіраць, усе астатнія банды ты». (?!) Нічога дзіўнага, што калектывізацыя па раёне стаіць на адным месцы. У вёсцы Асінаўка на агульным сходзе вынесьлі пастанову: «калектывізацыю адкласьці да вясны» (прат. ад 4-IX-31 г.)

Трэба раённым партыйным арганізацыям і РВК узмацніць сваю ўвагу да гаспадарчапалітычнага ўзмацненьня калгаснага руху па ўсім раёне. Трэба неадкладна ачысьціць некаторыя калгасы ад клясава-варожых элемэнтаў. Плян асеньняй сяўбы, зяблевага ворыва і жывёлагадоўлі павінен быць выканан. Брыг. «С. Б.» Шылянкоў.

Штурм за пяршынства раёну

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Райкомам партыі, райвыканкомам і райкалгассаюзам абвешчан 6-тыднёвы штурм барацьбы за пяршынства раёну па выкананьні ўсіх гаспадарчапалітычных кампаній трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Задача 6-ці тыднёвіка—датэрміновае выкананьне ўсіх без выключэньня плянавых задач па гаспадарча-палітычнай рабоце раёну, усямернае арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, арганізацыя працы, пастаноўка справы вучоту, правядзеньня зьдзельшчыны, барацьба за якасьць работы, арганізацыя высокатаварных налгасных фэрм, стварэньне кадраў.

Створан раённы штаб, які кіруе штурмам. У сельсавеце створаны штабы, куды ўваходзяць члены раённага штабу. У штурме ўдзельнічае 800 чал. актывістаў. Штурм павінен паказаць хто з калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў займе першае месца ў раёне. Раён павінен узяць першае месца па БССР.

Брыгадзір «Савецкай Беларусі» Шылянкоў.

-ты аб'яднаны рэйд ударнікаў „Правды", „Зьвязды" і „Сав. Беларусі"

Ніводнага кілё бульбы і гародніны

не павінна застацца на палёх і гародах

Бесьперабойная работа транспарту—залог сваячасовасьці адгрузкі. Загатоўчыя арганізацыі яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы работы

МЦРК не падрыхтаваны

Да загатовак і хаваньня гародніны і бульбы садова-гародны сэктар МЦРК яшчэ не падрыхтаваўся. Адным з вузкіх месц зьяўляецца недахват тары. Замест 75.000 мяхоў ёсьць толькі 15.000. Для таго, каб паменшыць патрэбнасьць у мяхох, яны заменены скрынкамі, на базе мэханізавана разгрузка, праведзена вузкакалейка, але гэтага мала.

Па пытаньні аб перапрацоўцы гародніны і садовіны, адказны работнік па гэтай галіне тав. Синкевіч, паведаміў наступнае: паводле пляну намечана адкрыць адзін квасільны пункт, які ў хуткім часе будзе скончан пабудовай; павінна быць пабудавана два засолачных пункты, а пабудаваны толькі адзін. Замест таго, каб заквасіць 1.200 тон капусты, як гэта меркавалася паводле пляну, раньняй капусты заквашана 60 тон, замест заквасі 400 тон памідораў, заквашана—130. Апошняе тлумачыцца недахватам бочак.

З Белкаапсаюзам заключан дагавор на пастаўку 270 тон грыбоў для засолкі і хаваньня, але гэты дагавор ня выконваецца. Пакуль што з гэтай колькасьці паступіла толькі 30 тон. Значна лепшая справа з выкананьнем пляну сушкі садовіны. Трэба было засушыць 150 тон садовіны, а засушана—200 тон. З-за недахвату бочак зрываецца мочка яблык: замест 2.000 тон замочана толькі 150

Значным тормазам у справе прыёмкі гародніны і садовіны зьяўляецца адсутнасьць дастатковай колькасьці спэцыялістаў. Мы лічым, што ў зьвязку з неабходнасьцю шырока разгарнуць апрацоўку гародніны і садовіны па ўсёй БССР Белкаапсаюз павінен заняцца падрыхтоўкай адпаведных кадраў.

Другім вузкім месцам работы ЦРК зьяўляецца недахват транспарту. Раней былі заключаны дагаворы з Гарсаветам аб прадастаўленьні МЦРК транспарту Гарсавету, але апошні адмовіўся ад дагавароў у зьвязку з пераводам транспарту на абслугоўваньне будаўніцтва. МЦРК патрэбна штодзёнь 60 фурманак, а мае ён толькі 23. У лістападзе колькасьць патрэбных фурманак яшчэ больш павялічыцца (да 120 штодзёнь), а для забесьпячэньня сябе транспартам МЦРК рашучых мер ня прымае.

Вельмі мала зроблена і ў справе загатоўкі бульбы. Паводле пляну МЦРК павінен загатовіць 19.978 тон бульбы Для разгортваньня загатовак у раёны паслана 40 чалавек замест патрэбных 48. Калі наша брыгада зазначыла загадчыку сэктару садгародніны МЦРК тав. Турэцкаму аб тым, што яшчэ неўкамплектавана патрэбная колькасьць загатоўшчыкаў, ён адказаў. «Ня ваша справа. Вас ня пытаюцца. Без вас дасталі 40 чалавек, без вас дастанем астатніх».

Мы лічым, што гэтыя словы тав. Турэцкага сьведчаць аб тым, што ў апараце МЦРК маюцца яшчэ такія «работнікі», якія сваімі бюракратычнымі адносінамі перашкаджаюць справе рабочага забесьпячэньня. На такіх «работнікаў» трэба адпаведным чынам узьдзейнічаць.

Брыгада: Нікіцін, Рабіновіч.

Чырвоныя эшалёны бульбы--пралетарам Ленінграду

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу ад нашага карэспан.).

25 верасьня Бабруйскім райкаапсаюзам накіраваны ў Ленінград чырвоны эшалён з 32 вагонаў бульбы .

Актыўны ўдзел у арганізацыі эшалёну прынялі калгасы і аднаасобнікі Міхалеўскага, Кавалеўскага, Мальеўскага і Турнаўскага сельсаветаў.

Задача і адпраўка эшалёну праведзена ў 3 дні.

ДАМБРОЎСКІ.

Слыніць бяссэнсныя перавозкі

У Белсельпроме наша брыгада выявіла цэлы рад непаладак у рабоце гэтай арганізацыі.

Ёсьць факты, што прывезеных у Бабруйск яблык, там, з-за адсутнасьці тары, не прынялі. Бочкі, якія накіроўваюцца з гатовай прадукцыяй ў Белкаапсаюз, назад не зварочваюцца. Гэта бязумоўна дрэнна адбіваецца на загатоўках.

Плян загатоўкі яблык выканан прыблізна на 46 проц.

У загатоўках бульбы для заводаў Белсельпрому існуюць вялікія няўвязкі. Бывае так, што з раёнаў, дзе знаходзяцца заводы, вывозіцца бульба, а пасьля зноў увозіцца для гэтых заводаў з іншых месц: з Рэчыцы вывозяць у Гомель, а з Камарына ўвозяць у Рэчыцу.

Брыгада: Зэльцер, Пашкевіч, Кофман.

З-за злачынкай нядбайнасьці кліентуры прастойваюць вагоны і псуецца гародніна

Мы цікавіліся пытаньнем як праходзяць разгрузкі садовіны і гародніны на чыгуначнай станцыі і выявілі, што тут наглядаюцца выпадкі несваячасовага выкупу садовіны і гародніны ЦРК і БКС. У выніку таміх зацяжак партыя гуркоў і бульбы, выгружаная ў пачатку жніўня пад адкрытае неба, папала пад дождж і папсавалася. Бываюць таксама выпадкі, калі гародніна прыбывае ўжо папсаванай з-за дрэннай упакоўкі і адсутнасьці вэнтыляцыі ў вагонах.

Чыгуначныя арганізацыі прымушаны прадаваць в таргоў атрымлёваныя грузы садовіны і гародніны ў зьвязку з нявыкупам яе кліентурай.

Брыгада: Салаеў, Соіф і Кічына.

Бальшавіцкімі тэмпамі рушыць наперад

разьвіцьцё прамысловай каапэрацыі

Разгортваньне промыслаў на недэфіцытнай мясцовай сыравіне—у цэнтр увагі

„Посьпехі індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі выклікалі рост новых галін прамысловай каапэрацыі, якія маюць важнае значэньне для здавальненьня патрэб дзяржаўнай прамысловасьці і калектыўных гаспадарак, зьмяняюць характар існуючых промыслаў і павялічваюць значэньне прамысловай каапэрацыі ў народнай гаспадарцы" (З паст. СНК БССР „Пра прамысловую каапэрацыю" ад 30 VII 1931 г.).

Становішча і далейшае разьвіцьцё прамкаапэрацыі БССР

Разьвіцьцё прамысловай каапэрацыі БССР характарызуецца наступнымі данымі: выпуск прадукцыі сыстэмай па сабекошту складае ў 1928-29 г. 34,8 міл. руб., у 1929-30 г.—58,2 і ў 1931 г.—139,2 міл. руб. Прычым, у 1931 г. значна павялічылася ўдзельная вага прадукцыі промыслаў, якія працуюць на мясцовай сыравіне (з 38,7 проц. у 29-30 г. да 40,7 проц. у першым паўгодзьдзі 1931 г.) і садзейнічаюць разьвіцьцю прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. У 1931 г. сыстэма павінна выпусьціць 90 міл. штук цэглы, 215 тыс. тон торфу, 18 тысяч тон смалы і інш.

У промыслах працуючых на прывозной сыравіне значнае месца займае швэйны, абутковы і мэталяапрацоўчы промыслы. Па пляну на 1931 г. выпуск прадукцыі намечан: па швэйным промысьле на 25,1 міл. руб., па абутковым на 13,5 міл. руб. і па мэталяапрацоўчым на 9,9 міл. руб. Па абутковым і мэталяапрацоўчым промыслах галоўным чынам разьвіваецца рамонтная справа. У буйных цэнтрах Менск, Віцебск, Гомель і інш. была арганізавана шырокая сетка пачынаючна-абутковых майстэрняў, прычым пры фабрыках і заводах гэтыя майстэрні—закрытыя, выключна для абслугоўваньня рабочых даных прадпрыемстваў. Для абслугоўваньня патрэб сельскага сэктару арганізаваны сталыя брыгады пры калгасах і ў меру патрэбы, асабліва ў час пасеўнай кампаніі, арганізуюцца выязныя брыгады. Мэталяапрацоўчы промысел ў асноўным знаходзіцца ў месцачковых і сельскіх мясцовасьцях і займаецца рамонтам с-гасп. інвэнтара.

Зусім слаба разьвіцьцё атрымала рамонтная і заказная справа ў швэйным промысьле.

Значна ўзрасла колькасьць аб'яднаных прамкаапэрацыяй членаў арцеляй: з 18.087 чал. на 1-X-29 г. да 42.696 на 1-VI-1931 г., пры павялічэньні ўдзельнай вагі каапэраваных у мястэчках з 32,3 проц. на 1-X-29 г. да 34,4 проц. на 1-IX-31 г. і ў вёсцы з 26,9 проц. на 1-IX-29 г. да 31,2 проц. на 1-VI-31 г. Работа на вёсцы выразілася ў арганізацыі 34 прамкалгасаў. Пры разгортваньні работы ў калгасах меў месца рад непаразуменьняў паміж калгасамі і прам. арцелямі, якія тлумачацца неразуменьнем некаторымі кіраўнікамі калгасаў і райкалгассаюзаў важнасьці разьвіцьця промыслаў у калгасах.

Аднак, неабходна адзначыць, што вынікі паўгадавога выкананьня прамфінпляну 1931 г. гавораць аб тым, што сыстэма яшчэ не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі. Прамфінплян 1931 г. за першае паўгодзьдзе выкананы на 35,9 проц.. Прычым, неабходна адзначыць, што прарыў ёсьць у промыслах, маючых асоба важнае значэньне ў народнай гаспадарцы нашай краіны (буд. матар'ялы—12 проц., лесахімія—32,8 проц., дрэваапрацоўка 27,8 проц.) Гэта таксама зьяўляецца вынікам апартуністычных адносін паасобных арганізацый і работнікаў сыстэмы да выкананьня ўскладзеных партыяй і ўрадам на прамкаапэрацыю задач.

У сыстэме да гэтага часу не перабудаван прынцып зарплаты. Зьдзельная аплата працы разьвіта недастаткова, на яе яшчэ зьвяртаецца малая ўвага. У арцелях наглядаецца абязьлічка і безадказнасьць за даручаную работу яшчэ ня зусім здавальняюча праведзены пераход арганізацый сыстэмы на гаспадарчы разрахунак.

Культ. масавая работа не прыстасавана да задач выкананьня прамфінпляну і разьвіцьця новых сацыялістычных мэтадаў працы.

У справе ўцягненьня ў сыстэму новых арцельшчыкаў наглядаўся самацёк. Ніякай сыстэматычнай арганізацыйнай работы па ўцягненьні новых кадраў рабочай сілы і замацаваньні працуючых не праведзена, у выніку чаго выкананьне гадовага пляну па каапэраваньні складае за паўгодзьдзе толькі 33 проц. Дрэнна абстаіць справа з улікам якасных паказьнікаў у выкананьні прамфінпляну. Асабліва трэба падкрэсьліць нездавальняючае становішча якасьці выпушчанай прадукцыі.

Усебеларускі Зьезд Прамысловай Каапэрацыі, які адбыўся ў ліпені, адзначыў усе недахопы ў рабоце сыстэмы і выпрацаваў, у адпаведнасьці з апошнімі рашэньнямі партыі і Ўраду, рад мерапрыемстваў па ліквідацыі недахопаў і прарываў. Станоўчую ролю ў гэтых адносінах павінна адыграць рэорганізацыя сыстэмы прамысловай каапэрацыі на аснове спэцыялізацыі. Згодна рашэньня СНК БССР ад 30-VII арганізаваны 9 галінных гаспадарча-разрахункавых аб'яднаньняў. Дзякуючы гэтаму павінна быць палепшана вытворча-тэхнічнае кіраўніцтва работай сыстэмы і створана канкрэтнае кіраўніцтва. Гэта рэарганізацыя павінна служыць моцным сродкам мабілізацыі арцельных мас на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну 1931 г. з тым, каб забясьпечыць далейшае разьвіцьцё сыстэмы ў 1932 г. у адпаведнасьці з патрабаваньнямі разьвіцьця ўсяе народнай гаспадаркі.

Па кантрольных копках на 1932 г. намечан выпуск прадукцыі па адпускной цане ў суме 280 міл. руб. супроць 180 у 1931 г., пры адначасовым павялічэньні колькасьці каапэраваных з 70 тыс. чалавек да 96 тысяч чалавек.

У суме прадукцыі на 1932 г. намечаецца далейшы рост промыслаў, працуючых на мясцовай сыравіне і маючых важнае народна-гаспадарчае значэньне: па торфе намячаецца выпусьціць 840 тысяч тон замест 215 тыс. тон у 1931 г.; па цэгле—128 міл. штук замест 90 міл. шт. у 1931 г.; па ганчарнай чарапіцы 7 міл. штук замест 1,2 міл. штук. Адначасова намячаецца пашырэньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня (мэблі замест 5 міл. у 1931 г. на 8 міл. у 1932 г., рамонт абутку замест 10 міл. 18 міл. у 1932 г. і інш.) і промыслаў садзейнічаючых палепшаньню бытавога абслугоўваньня працоўных мас (арганізацыя сталовак, пралень, стандартнае домабудаўніцтва і інш.).

Задачы, якія стаяць перад сыстэмай, павінны і могуць быць выкананы. Неабходна рашуча перабудаваць работу ў адпаднасьці з новымі ўмовамі, мабілізаваць вакол задач актыўнасьць каапэраваных мас на максымальнае разьвіцьцё сацыялістычных мэтадаў працы, на барацьбу з усімі праявамі апартунізму і самацёку з тым, каб быў дан рашучы адпор усім тым, хто будзе перашкаджаць выкананьню гэтых задач. С.

Разьвіцьцю інвалідзкай каапэрацыі належная ўвага

Сыстэма інвалідзкай каапэрацыі БССР паставіла перад сабой мэту поўнасьцю рэалізаваць пастанову XVI зьезду УсеКП(б), якая яскрава адзначае ролю лёгкай і саматужнай прамысловасьці ў рэканструкцыйны пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва.

Інвалідная каапэрацыя ставіць сабе на мэце замяніць непасрэднае пэнсіянаваньне інвалідаў, маючых права на матар'яльную дапамогу з боку дзяржавы, працаўстройствам іх у такіх галінах вытворчай дзейнасьці ,якія адпавядаюць іх здольнасьцям і стану здароўя.

СНК БССР яшчэ ў сакавіку месяцы мінулага году ў сваёй пастанове аб інвалідзкай каапэрацыі намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па зьнішчэньні маючыхся недахопаў і хваравітых зьявішчаў у сыстэме інвалідзкай каапэрацыі і вызначыў напрамак далейшай яе работы. Галоўным у рабоце сыстэмы зьяўляецца пашырэньне і разгортваньне вытворчай дзейнасьці на недэфіцытнай, мясцовай сыравіне, з найбольшым ахопам інвалідаў працаўстройствам, асабліва ў сельскіх мясцовасьцях.

У сыстэме інвалідзкай каапэрацыі маецца 31 арцель, з якіх вытворчых—10, з лікам занятых асоб 982, вытворча-гандлёвых—18 з колькасьцю 1.141 чал. і гандлёвых—3, з колькасьцю—219 чал. Усяго зараз у сыстэме інвалідзкай каапэрацыі працуе 2.437 чалавек супроць 2.174 у 1930 годзе. За першае паўгодзьдзе 1931 году колькасьць працаўстроеных інвалідаў павялічылася на 263 чал.

Далейшы рост інвалідзкай каапэрацыі мае выключна вытворчы характар. Рост валавой прадукцыі значна павялічыўся. У 1929-30 г. валавая прадукцыя складала 5.946.000 руб., у асобны квартал 1930 г.—2.116.000, а за адно першае паўгодзьдзе 1931 г. складае ўжо 4.473.000 руб.

Павялічылася і паянакапленьне. У 1929-30 годзе сума па паянакапленьні складала 27.365 руб., у асобным квартале 1930 г.—22.768 руб., а ў першым паўгодзьдзі 1931 г.—51.387 руб.

У першым паўгодзьдзі 1931 году пераведзена на 7-гадзінны рабочы дзень 2 арцелі, а да канца бягучага году будуць пераведзены яшчэ некаторыя больш буйныя арцелі. Перавод арцеляй на 7-гадзінны рабочы дзень утвараецца выключна за кошт мэханізацыі і рацыяналізацыі вытворчасьці.

Побач з дасягненьнямі ў рабоце інвалідзкай каапэрацыі, маюцца і значныя недахопы. Прамфінплян за першае паўгодзе бягучага году па вытворчых арцелях выкананы на 89,6 проц., не пераведзены на гаспадарчы разрахунак паасобныя цэхі, прамова тав. Сталіна не знайшла належнага водгуку па ўсёй сыстэме і паасобных яе зьвенньях. У выніку чаго, у нас наглядаецца цякучасьць рабочай сілы, існуе абязьлічка, урафіляўка ў заработнай плаце, што перашкаджае выкананьню прамфінпляну. З боку кіруючага складу арцеляй ня выкарыстаны правы адзінаначальля, у выніку чаго культурнае працаўсыцыпліна, наглядаюцца моманты п'янства, рвацтва і да іх падобныя адмоўныя зьявішчы. (Менск, арцель № 3, Дуброўна, Віцебск і інш.).

Партарганізацыі і праўленьні арцеляй ня сталі на чале кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам. Таксама не дастаткова разгорнута культурна-выхаваўчая работа ў арцелях і зусім дрэнна пастаўлена работа па ахове працы інвалідаў.

Вышэйпералічаныя факты ў значнай ступені адбіваюцца на выкананьні прамфінпляну.

Адначасова з гэтым, выкананьне прамфінпляну залежыць ад забесьпячэньня арцеляй сыравінай. У гэтай галіне работы маецца значны прарыў. На прыклад, абутковая прамысловасьць у 1-м паўгодзьдзі была забясьпечана сыравінай на

ПАЛАЖЭНЬНЕ

аб арганізацыі працы ў жывёлагадоўчых малочна-таварных фэрмах БССР

(Палажэньне гэта зьяўляецца прыкладным і можа быць зьменена ці дабаўлена па пастанове праўленьня калгасу МТФ)

I. АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

Пасьпяховасьць работы малочна-таварнай фэрмы цалкам залежыць ад таго, як калгасы і калгасьнікі будуць весьці працу па палепшаньні прадукцыйнасьці малочнага стада, праводзіць зоамерапрыемствы, будаўніцтва і прыстасаваньне лепшых кароўнікаў і цялятнікаў і забясьпечваць МТФ кармамі, вылучаць лепшых і найбольш вопытных калгасьнікаў, калгасьніц для працы па МТФ і арганізоўваць іх працу мэтадам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, на барацьбу з кулаком і яго агентурай, за ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны і гаспадарчай беражлівасьці.

Самым галоўным недахопам у арганізацыі малочна-таварных фэрм зьяўляецца: адсутнічаньне зьдзельшчыны, улік ня колькасьці і якасьці працы, а затрачанага часу, частая зьмена працаўнікоў па фэрмах, наяўнасьць абязьлічкі і інш., што прыводзіць да адсутнасьці зацікаўленасьці (калгасьнікаў да падняцьця вытворчасьці працы і яе якасьці, цягне за сабою нізкія ўдоі, павялічэньне процанту падзяжу пры выхоўваньні цялят і шмат іншых нездаровых зьяўшч.

У мэтах зьнішчэньня гэтых хвароб ных зьяўшч і падвышэньня эфэктыўнасьці МТФ, Праўленьне Калгасцэнтру БССР і Бел. аддзяленьне Малкалгасцэнтру прапануюць Загадчыкам МТФ, Праўленьням калгасаў, Калгасаюзам і Райвыканкамам (Райупаўнаважаным) Малкалгасцэнтру ўвесьці наступны парадак расстаноўкі рабочае сілы і арганізацыі працы ва ўсіх МТКФ.

1) Для кіраўніцтва МТФ Праўленьне калгасу вылучае асобнага загадчыка фэрмы. Загадчык фэрмы зацьвярджаецца Упаўнаважаным Беларускага Аддзяленьня Малакацэнтру.

2) Загадчык фэрмы прызначаецца тэрмінам ня менш 2-х год. Зьмена яго можа быць утворана толькі па ўзгадненьню з Упаўнаважаным Бел. Аддзяленьня Малакацэнтру.

II. АРГАНІЗАЦЫЯ БРЫГАД І ЗАМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСЬНІКАЎ НА РАБОЦЕ МТФ.

1) На падставе гадавога пляну МТФ складаюць рабочыя пляны на пасабныя пэрыяды—пашавы і стойлавы. У рабочых плянах павінна быць устаноўлена вытворчае заданьне кожнай брыгадзе, групе і калгасьніку, а таксама паказваецца парадак яго ажыцьцяўленьня і ацэнка заданьня ў працаднёх.

2) Для абслугоўваньня малочна-таварных фэрм Праўленьне калгасу вылучае патрэбную колькасьць лепшых калгасьніц і калгасьнікаў, ў першую чаргу з ударнікаў і тых, якія маюць вопыт у малочнай жывёлагадоўлі і жадаючых працаваць па жывёлагадоўлі. Вылучаныя для работы на МТФ калгасьнікі працуюць пад кіраўніцтвам загадчыка фэрмы і замацоўваюцца на фэрмах на сталую працу.

3) Пры разьмерах фэрмы да 150-160 галоў жывёлы для яе абслугоўваньня арганізуецца адна брыгада, прыкладна ў складзе 15—18 асоб. У больш буйных фэрмах (200—300 і звыш галоў) арганізуецца дзьве альбо больш брыгад. У зімовы пэрыяд гэтыя брыгады раёцца арганізоўваць па скотных дварох, а ў летні пэрыяд па стадах (кароў, нецялят, цялят, вытворнікаў і інш.). Колькасьць людзей у брыгадзе і групе вызначаецца ў залежнасьці ад колькасьці жывёлы, выходзячы з норм нагрузкі Калгасцэнтру БССР, прапрацаваных калгасам і прыстасаваных да канкрэтных умоў гаспадаркі фэрмы.

4) Склад брыгады павінен быць сталым у працягу ня менш году. Перавод калгасьнікаў МТФ на іншыя работы дапушчаецца толькі пры неабходнасьці скарачэньня колькасьці калгасьнікаў жывёлагадоўчай брыгады (пры пераходзе ад стойлавага ўтрыманьня да пасьбішчнага і г. д.).

5) Брыгада разьбіваецца на групы адпаведна іх вытворчым заданьням: група—цялятніц, група—па догляду за гульлявой жывёлай, група даярак, група скотнікаў па догляду за дойнымі каровамі і інш. Унутры групы за кожным паасобным скотнікам ці даяркай замацоўваецца адпаведная колькасьць жывёлы, за становішча якой яны нясуць асабістую адказнасьць (у практыцы МТФ маецца і такі парадак: на скотным дварэ пры 100 гал. малочнай жывёлы брыгада складаецца так: старшая скотніца, 10 жанчын даярак, 2 вартаўнікі. Кармы падвозяцца ў кармавое аддзяленьне скотнага двара асобнымі працаўнікамі. На абавязку старшай скотніцы ляжыць кіраваньне работай на скотным дварэ, нагляд за выкананьнем правілаў унутранага распарадку, улік удояў ад кожнай каровы, улік працы па МТФ і інш. На абавязках жанчын даярак ляжыць харчаваньне, паеньне, дойка, чыстка і мыцьцё кароў, утрыманьне ў чыстаце малочнай пасуды, прыборка гною са стойлаў. Да кожнай жанчыны даяркі прымацавана 10 кароў, за якіх яна адказвае. У час між дойкамі з паказаных жанчын даярак 1—2 застаюцца дзяжурнымі, увесь час падтрымліваюць парадак і чыстату на скотным дварэ).

За лепшымі калгасьніцамі даяркамі і калгасьнікамі, добра даглядаючымі за жывёлай, замацоўваецца больш каштоўная і лепшая жывёла.

Разьбіўка жывёлы па групах і прымацаваньне яе да калгасьнікаў ўтвараецца з улікам якаснага і пароднага падбору жывёлы.

6) У МТФ разьмерам да 150-160 галоў загадчык фэрмы адначасова выконвае ўсе абавязкі брыгадзіра. У буйных МТФ, маючых некалькі асобных брыгад, брыгадзіры, зьяўляючыся старшымі скотнікамі, альбо старшымі даяркамі, назначаюцца загадчыкам фэрмы з ліку найбольш вопытных і актыўных калгасьнікаў, зьяўляючыхся перадавымі па ўжываньні сацыялістычных форм працы (сацспаборніцтва і ўдарніцтва).

Там, дзе па разьмеры стада не патрабуецца вылучэньне спэцыяльнага брыгадзіра (старшага скотніка, альбо старшай даяркі), з ліку скотнікаў ці даярак могуць быць назначаны старшыя, адначасова выконваючыя разам з калгасьнікамі і сваю працу, па догляду за прымацаванай за імі жывёлай.

III. УНУТРАНЫ РАСПАРАДАК НА МТФ.

1) Усе работы на жывёлагадоўчай фэрме вядуцца па правілах ўнутранага распарадку фэрмы. Гэтыя правілы распрацоўваюцца загадчыкам фэрмы, зацьвярджаюцца Праўленьнем калгасу.

2) Кожны працуючы на МТФ павінен дасканала выконваць устаноўленыя для яго круг абавязкаў і прыняты распарадак на МТФ. Работы на фэрме разьмяркоўваюцца, прыкладна, так:

СТОЙЛАВЫ ПЭРЫЯД.

Работы на скотным дварэ пачынаюцца а 4-й гадзіне раніцы і вядуцца ў наступным парадку:

а) адграбаньне ці падпраўніваньне гною;

б) падмываньне вымяні і дойка а 5-й гадзіне раніцы;

в) харчаваньне. Кармы раздаюцца згодна норм у кожнай гаспадарцы, устаноўленых у залежнасьці ад прадукцыйнасьці жывёлы і наяўнасьці кармоў. Раніцой раздаецца прыкладна палавіна дзённай нормы канцэнтраваных кармоў, палавіна нормы сакавітых і адна трэць грубых кармоў;

г) а 9-й гадзіне чыстка кароў, паеньне і выган на прагул; у часы прагулу скотнікамі вытвараецца ачыстка кармушак, чыстка памяшканьня і вываз гною, альбо падсьцілка сьвежага подсьпілу пры гноєвым утрыманьні;

д) а 12-й гадзіне другая дойка;

е) а 2-й гадзіне другое харчаваньне жывёлы (таксама прыкладна палавіна канцэнтраваных кармоў, палавіна сакавітых і адна трэць сухіх грубых кармоў сутачнай нормы);

ж) а 7-й гадзіне ўвечары 3-я дойка, а потым закладка кармоў на нач (апошняя трэць сухога грубага корму);

з) усёй працы на скотным двары і продукцыі вядзецца строгі вучот і запіс па ўстаноўленай форме;

і) цялята да 1-го году ў асноўным разьмяркоўваюцца на дзьве групы: цялята, выпайваемыя поўнасьцю ці часткова малаком і цялята, пераведзеныя на корм без малака;

к) кармёжка цялят, выпайваемых малаком, зьвязана з атрыманьнем для іх сьвежага цэльнага малака і пагэтаму яна пачынаецца не пазьней 5-ці гадзін раніцы, гэта значыць, з пачатку дойкі кароў. Таксама прыстасоўваецца ў асноўным да гадзін дойкі другое і трэцяе кармленьне цялят;

л) часы кармленьня цялят да году, перазведзеных на кармёжку ўжо без цэльнага малака, прыстасоўваюцца да гадзін кармленьня ўсяе жывёлы;

м) для цялят малочнага ўзросту, на чынаючы з тыднёвага, вельмі карысны прагулкі, якія кожны дзень пры здавальняючым надвор'і павінны вытвараца паміж 12-ю і 14-ю гадзінамі дню, працягам да 2-х гадзін;

н) па спэцыяльным цялячым фэрмам, дзе не маецца дойных кароў і пачатак працадню не зьвязан з дойкай, працоўны дзень можа пачынацца з 5—6-ці гадзін раніцы, адпаведна зьменьваючы і больш роўна ўстанаўліваючы інтэрвалы паміж кармёжкамі. Распарадак па догляду за маладняком на цялячых фэрмах у асноўным такі-ж як і на малочных таварных фэрмах.

ПАШАВЫ ПЭРЫЯД.

1. Жывёла ўсіх узростаў і груп павінна шырока карыстацца натуральнымі і штучнымі выпасамі.

2. Патрэбна ўвесьці такі парадак, каб жывёла на працягу ўсяго пашавага пэрыяду ўдостаць карысталася сакавітымі пашавымі кармамі. Недахоп харчаваньня на пашы павінен папаўняцца кошанай зялёнай падкормкай, для чаго акрамя пасеву на сілос і на сена павінен быць прадугледжан пасеў для падкормкі;

а) азімае жыта, а лепш жыта з азімай вікай;

б) авёс з вікай пасеву некалькіх пэрыядаў; (раньні, сярэдні, позьні);

в) канюшына, сярэдэля і інш.;

г) пасеў пажнўных культур;

д) скарыстаньне бацьвіньня, атавы і іншых адкідаў да засіласаваньня.

3. Быкі-вытворнікі пры ручной злучы павінны карыстацца таксама, як іншая жывёла, выгуламі, выпасамі і падкормкай зялёнага корму.

4. У летні час, асабліва ў час жары, праца на МТФ павінна пачынацца не пазьней 3-х гадзін раніцы і праходзіць ў наступным парадку:

а) з 3—4-х гадзін дойка кароў;

б) не пазьней 4-х гадзін раніцы жывёла павінна выганяцца на пашу;

в) з 11-ці да 3-х гадзін жывёла адпачывае ў скотным двары, альбо на пашы ў спэцыяльна прыстасаваных станках;

г) з 3-х гадзін да 9-ці ў летні пэрыяд зноў пасьвіцца;

д) дзённая дойка з 12-ці да 1-й гадзіны, вячэрняя дойка з 9-ці да 10-ці гадзін.

У пэрыяд найбольшай жары кожная фэрма абавязкова павінна арганізаваць начную пасьбу жывёлы.

З мэтай даць жывёле больш адпачынку, не ўтамляць яе лішнімі перагонамі і даць магчымасьць найбольш карыстацца вольным паветрам, летам, як правіла, дойка кароў дзённая арганізуецца на пашы.

IV. АБАВЯЗКІ ПРАЦАЎНІКОЎ МТФ.

А. Загадчык МТФ.

1) Загадчык фэрмы аднаасобна адказвае за арганізацыю фэрмы, пастаноўку і вядзеньне ўсёй работы на фэрмэ, выкананьне вытворчага пляну, захаваньне кармоў, падвышэньне продукцыйнасьці жывёлы, зьніжэньне падзяжу, ялавасьці кароў, за чыстату і парадак на фэрмэ, за недапушчэньне пабоєў жывёлы скотнікамі, за цэласьць стада фэрмы і прадукцыі.

2) Камплектуе стада малочна-таварных фэрм, прымае арганізацыйныя захады да павялічэньня прадукцыйнасьці жывёлы і ўтварае здачу таварнае прадукцыі па пляну, які зацьвярджаецца Упаўнаважаным Малкалгасцэнтру.

3) Праводзіць будаўніцтва па фэрме з разьліку забясьпечаньня ўсяго стада памяшканьнямі.

4) арганізуе працу і кіруе ўсімі работамі на фэрме, разьмяркоўвае калгасьнікаў на работу і замацоўвае кожнага да адпаведнай групы жывёлы.

5) Праводзіць зоатэхнічныя і вэтэрынарныя мерапрыемствы, прадугледжаныя вытворчым пляном і зоавэтмінімумам.

6) Арганізуе мерапрыемствы па кормазадбываньні, захоўваньні кармоў, скарыстоўвае ўсе магчымасьці па стварэньні кармавых фондаў.

7) Кіруе скарыстаньнем кармоў і тэхнікай кармленьня.

8) Арганізуе і кіруе вучотам вытворчасьці і працы.

9) Арганізуе супроцьпажарныя меры, а таксама меры захаваньня ў цэласьці маёмасьці і каштоўнасьці фэрмы.

10) Загадчык фэрмы атрымлівае ад Праўленьня калгасу вытворчае заданьне на год. Вытворчае заданьне брыгадзе загадчык фэрмы дае па пэрыядах і месяцах.

11) Усю сваю работу загадчык будуе на падставе палажэньня аб загадчыках фэрмамі, зацьверджанага Малкалгасцэнтрам.

Б. АБАВЯЗКІ ЗООТАЭХНІКА (ТЭХНІКА ЖЫВЁЛАВОДА)

1) Складае сумесна з загадчыкам МТФ вытворчы плян фэрмы.

2) Распрацоўвае і праводзіць усе зоатэхнічныя і вэтэрынарныя мерапрыемствы на фэрме і видзе запісы па стаду жывёлы. Арганізуе ўзважваньне ці абмеры жывёлы і інш.

3) Распрацоўвае сумесна з загадчыкам фэрмы нормы харчаваньня, арганізуе і кіруе правільным харчаваньнем жывёлы па нормах.

4) Утварае бракоўку стада дойных кароў, цялят і вытворнікаў.

5) Утварае падбор стада па прадукцыйнасьці з улікам племянных якасьцяй.

6) Устаноўляе парадак злучак, распрацоўвае плян злучкі, з разьлікам ліквідацыі ялавасьці і патрэбнага рэгуляваньня ацёлам, праводзіць у жыцьцё ўстаноўлены парадак злучкі.

7) Арганізуе і праводзіць курсы, лекцыі і гутаркі па жывёлагадоўлі ў парадку ўкараненьня тэхнікі жывёлагадоўлі ў масы.

8) Сочыць за санітарным становішчам фэрмы.

Зоатэхнік асабіста нясе адказнасьць за зоатэхнічнае і санітарнае становішча фэрмы. Нармальным становішчам у зоатэхнічных адносінах лічыць, калі:

а) ўся жывёла разьмеркавана на групы па аднольказвых адзнаках;

б) харчаваньне і догляд утвараецца па ўстаноўленых нормах і правілах;

в) скотнікі, даяркі, цялятніцы і інш. ведаюць свае абавязкі і акуратна іх выконваюць;

г) устаноўлен і праводзіцца зоатэхнічны рэжым, які зьнішчае мажлівасьць паяўленьня захворваньняў і забясьпечвае нормальнае харчаваньне жывёлы на ўвесь час, як у зімовы, так і ў летні пэрыяды;

д) памяшканьне фэрмы скарыстоўваецца рацыянальна, жывёла здаровая, нармальнай ухарчаванасьці;

За адсутнасьцю зоатэхніка абавязкі яго выконвае тэхнік па жывёлагадоўлі, або старшы скотнік.

В. АБАВЯЗКІ БРЫГАДЗІРА (старш. скотніка).

1) Брыгадзір (старшы скотнік), ці старшая даярка адказваюць аднаасобна за ўсю работу брыгады, за правільнае скарыстаньне працы калгасьнікаў, становішча стада, выкананьне пляну, выхад колькасьці і якасьці прадукцыі і захаваньне маёмасьці МТФ.

2) Брыгадзір атрымлівае вытворчыя заданьні ад загадчыка фэрмы, кіруе і ажыцьцяўляе кантроль над работай усёй брыгады.

3) Сочыць за дасканалым выкананьнем устаноўленага распарадку работчага дню і паасобных паказаньняў загадчыка фэрмы, зоатэхніка і вэтдоктара.

4) Накладвае спагнаньні на недысцыплінаваных калгасьнікаў, працуючых у брыгадзе, утварае ацэнку, вядзе вучот колькасьці і якасьці выконванай работы ў працаднёх і праводзіць запіс іх у працоўныя кніжкі калгасьнікаў, арганізуе ўлік прадукцыі.

5) Брыгадзір кіруе вытворчымі нарадамі брыгады, арганізуе і накіроўвае творчую ініцыятыву і працоўны ўздым калгасьнікаў сваёй брыгады на сацспаборніцтва і ўдарніцтва, адказвае за правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў вытворчых нарад.

Г. АБАВЯЗКІ СКОТНІКА.

1) Скотнік нясе адказнасьць за сваю групу жывёлы па догляду, харчаваньні і інш.

2) Задача кармоў і паеньне ўтвараецца па ўстаноўленым старшым скотнікам і загадчыкам фэрмы нормах у адпаведны час, ніякіх зьмен у харчаваньні і паеньні скотнік самастойна ня вытварае.

3) Прыбіраньне стойлаў, чыстка памяшканьняў і кармушак.

4) Выпуск жывёлы на прагул і пастаноўка яе па месцах пры звароце з прагулу.

5) Чыстка жывёлы, дапамога пры ручной злучцы, дапамога пры лячэньні і ацёле.

6) Кожны скотнік прымацоўваецца да сваёй групы жывёлы, што садзейнічае падвышэньню прадукцыйнасьці жывёлы лепшаму догляду, вывучэньні асаблівасьцяй жывёлы і інш.

7) Катэгарычна забараняецца самому і дазваляць іншым курыць на скотным дварэ, пунях, саломахавальніках і іншых мяцох, у якіх захоўваюцца хутказапальваючыяся рэчы.

8) Пры захворваньні жывёлы абавязан паведаміць старшага скотніка (брыгадзіра) альбо загадчыка фэрмы, якія павінны ўжыць меры ў адносінах захваравўшай жывёлы.

Д. АБАВЯЗКІ ДАІЛЬШЧЫЦЫ.

1) Дапамога скотнікам у раздачы кармоў.

2) Абмываньне вымяні кароў перад дойкай, па ўказаньні старшага брыгадзіра ці вэтдоктара, лячэньне саскоў, вымяні і масажаваньне вымяні.

3) Даеньне прымацаваных кароў ва ўстаноўлены час.

4) Працэжваньне малака і разьліўка яго ў пасуду.

5) Мыцьцё пасуды і захоўваньне яе ў чыстаце.

6) Выкананьне ўстаноўленых санітарна-гігіенічных правілаў на скотным дварэ і пры дойцы.

Такім-жа чынам устанаўліваецца круг абавязкаў даглядчыцам цялят за гуляй вой жывёлай і г. д.

Е. АБАВЯЗКІ ПАСТУХА.

Пастух павінен падбірацца з лепшых калгасьнікаў, па кваліфікацыі ня нізкай брыгадзіра ці старшага скотніка, так як яго праца мае надзвычайна вялікае значэньне ў сэнсе падвышэньня эфэктыўнасьці МТФ.

Пастух павінен:

1) Выганяць жывёлу на пашу ні ў якім разе не пазьней ўстаноўленага ўнутраным распарадкам часу.

2) Сумесна з зоатэхнікам ці загадчыкам фэрмы распрацоўваць і ажыцьцяўляць плян карыстаньня выпасамі, абавязкова ўводзячы вучасткі для пачарговага карыстаньня.

3) Пастух сочыць, каб на пашы жывёла атрымала тую колькасьць корму, якая вызначана нормамі і пры недахопе сумесна з старшым скотнікам, арганізуе падкормку.

4) Клапоціцца аб сваячасовым і аку ратным вадапоі, сумесна з загадчыкам фэрмы арганізуе месца вадапою.

5) Сочыць за паяўленьнем ахвоты ў кароў і прымае неадкладныя меры да арганізацыі злучкі.

6) Дапамагае скотнікам у раздачы падкормкі ў полі.

7) Сочыць за здароўем жывёлы, аказвае першую дапамогу, сваячасова дакладвае вэтдоктару, старшаму скотніку ці брыгадзіру.

8) Жывёла павінна быць разьбіта па групах (каровы, маладняк. цёлкі, асоб на бычкі). Пастух адказвае за сваю групу жывёлы.

Усю сваю працу на скотным дварэ працаўнікі фэрмы павінны арганізаваць так, каб максымальна захаваць цішыню, не турбаваць жывёлу крыкамі, шумам. Доступ пабочным асобам на скотны двор без дазволу загадчыка фэрмы сурова забараняецца. Ні ў якім разе таксама не дапушчаецца раздача малака на скотным дварэ,—малако за раз-жа пасьля дойкі і працэжваньня павінна адпраўляцца ў малочную ці іншае памяшканьне ,дзе яму даецца прызначэньне (адпраўка на завод, у горад, на станцыю, раздача калгасьнікам і г. д.)

V. АРГАНІЗАЦЫЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ Ў МТФ.

1) Усе работы ў МТФ без выключэньня павінны быць арганізаваны зьдзельна. У аснову сыстэмы зьдзельшчыны кладзецца прынцып ацэнкі працы ў працаднёх не па колькасьці абслугоўванай жывёлы, а па колькасьці атрыманай прадукцыі. Пры чым ацэнка вытвараецца не сярэдняя гадавая, а розная па пэрыядах ці месяцах, у залежнасьці ад удою стада, азначанага кантрольнымі заданьнямі для МТФ.

2) Сама ацэнка працы і налічэньне працадзён ут